незалежная газета

№ 36 (634) 30 верасня 2009

# Наша Ніва

www.nn.by

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Аплявуха Патрыярха**

Старонка 3

**«Міс Інтэркантынентань» палітычнага значэння**

Старонка 6




**У НУМАРЫ**

**Хмарачосы схаваліся**
Амбітныя праекты разбудовы сталіцы як мінімум адкладаюцца. **Старонка 4.**

**У Беларусь можа завітаць небяспечны грып з Аўстраліі**
Міністэрства аховы здароўя пацвярджае. **Старонка 5.**

**Як судзілі Аўтуховіча**
Расповед пра канфлікт прадпрымальніка і дзяржавы. Піша вызвалены Юры Лявонаў. **Старонка 7.**

**Prodigy ў Мінску**
Засталіся імгненні да прыбыцця лідэраў сусветнай танцавальнай музыкі. Піша Павал Касцюкевіч. **Старонка 11.**

**Розум паляпшае сперму**
Разумныя мужчыны больш прывабныя для жанчын, нават калі маюць не самыя рэльефныя мускулы. **Старонка 12.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Лукашэнка носіць гадзіннік за 16 тысяч даляраў

Фатографы атрымалі рэдкую магчымасць здымаць кіраўніка Беларусі свабодна — у часе яго візіту ў Літву. **Старонка 8.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ




PHOTO.BYMEDIA.NET

## Назаві беларускую мову роднай і хатняй!

Зварот лідэраў незалежнага грамадства. **Старонка 2.**

# «Беларусь не мост і не шлюз»

Патрыярх Маскоўскі выступаў у Мінску больш як палітык, чым як святар.

Ніколі раней ніводзін патрыярх Маскоўскі не рабіў столькі рэверансаў на адрас беларускай культуры і незалежнасці. Выступаючы ў Палацы Рэспублікі, патрыярх цытаваў Багдановіча, Быкава, згадаў Курапаты. Адначасова ён настойліва заклікаў да адзінства «Святой Русі».

Нават абсек Аляксандра Лукашэнку: Беларусь не мост між Усходам і Захадам, а частка Русі. І выказаў поўную палітычную падтрымку адміраючаму саюзу Беларусі і Расіі.

Гаворачы пра каштоўнасці, ён адкінуў вартасць поспеху любым коштам і дабрабыту па-над усім.

Прапануем урыўкі са стэнаграмы слова патрыярха Маскоўскага ў Палацы Рэспублікі ў часе сустрэчы з грамадскасцю.

### Царкве не па дарозе з уладай

Як важна, каб Царква ніколі і ні пры якіх абставінах не атаясамляла сябе з уладай, сілай, магутнасцю, але мела магчымасць пакорліва і спакойна сведчыць аб праўдзе Божай, якая, дакранаючыся да чалавечай свядомасці, развяртае асобу ў бок вечных, Божых каштоўнасцяў. І тады не будуць страшныя ніякія глабалізацыі, ніякі ўплыў звонку, калі ў людзей захаваецца гэтая здольнасць разварочвацца насустрач Божаму дыханню, дыханню Боскай любові.

**Працяг на старонцы 3.**

# Назаві беларускую мову роднай і хатняй!

Зварот лідэраў незалежнага грамадства з нагоды перапісу насельніцтва.

Шаноўныя сябры!

Праз некалькі дзён у нашай краіне пройдзе чарговы перапіс насельніцтва, адным з пунктаў якога будзе пытанне пра Вашу родную мову. Мы ведаем, што большасць з Вас шануюць беларускую мову.

Беларуская мова — гэта неад'емная частка нашай культуры і гарантыя нашай будучыні як унікальнага еўрапейскага народа.

Адказ «беларуская» на пытанні перапісчыкаў аб роднай мове і мове штодзённага ўжытку мае не толькі сімвалічнае, але і практычнае значэнне. Ад колькасці людзей, якія ў адказах назавуць беларускую мову, будзе залежаць далейшая палітыка дзяржавы.

Будзем жа памятаць пра гэта, адказваючы на пытанні перапісчыкаў.

Будзьма з мовай!

**Радзім Гарэцкі**, геолаг, акадэмік НАН Беларусі; **Рыгор Барадулін**, Народны паэт Беларусі; **Ніл Гілевіч**, Народны паэт Беларусі; **Генадзь Бураўкін**, паэт, былы пасол Беларусі пры ААН; **Анатоль Грыцкевіч**, прафесар, доктар гістарычных навук; **Святлана Зелянкоўская**, актрыса; **Лявон Вольскі**, лідэр гурту «NRM»; **Зміцер Вайцюшкевіч**, спявак, кампазітар; **Юры Жыгамонт**, акцёр, тэлевядучы; **Уладзімір Арлоў**, пісьменнік; **Алена Макоўская**, кіраўнік МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»; **Алег Трусаў**, старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны»; **Алесь Пашкевіч**, старшыня ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў»; **Андрэй Хадановіч**, старшыня ГА «Беларускі ПЭН-цэнтр»; **Антон Астаповіч**, старшыня ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры»; **Зміцер Рагачоў**, старшыня МГА «Гісторыка»; **Андрэй Скурко**, галоўны рэдактар газеты «Наша Ніва»; **Андрэй Дынько**, шэф-рэдактар газеты «Наша Ніва»; **Валеры Булгакаў**, рэдактар часопіса «Arche»; **Барыс Пятровіч**, рэдактар часопіса «Дзеяслоў»; **Артур Клінаў**, рэдактар альманаха «pARTisan»; **Віталь Супрановіч**, кіраўнік «БМА group»; **Аляксей Марачкін**, кіраўнік творчай суполкі «Пагоня» пры Беларускім саюзе мастакоў; **Міхал Мілашэўскі**, кіраўнік Незалежнай тэлестудыі «Брэнтстар»; **Віталь Броўка**, прадзюсер, арт-дырэктар; **Сяргей Будкін**, каардынатар музычнага партала «Тузін гітоў»; **Алесь Камоцкі**, спявак, паэт; **Кася Камоцкая**, спявачка; **Віктар Шалкевіч**, спявак, акцёр; **Таццяна Беланогая**, спявачка; **Міхал Анемпадыстаў**, дызайнер, аўтар «Народнага альбома»; **Глеб Лабадзенка**, журналіст; **Алекс Дэвід**, лідэр гурту «Atlantica»; **Ігар Варашкевіч**, лідэр гурту «Крама»; **Алег Хаменка і гурт «Палац»**; **Святлана Бень**, лідэр гурту «Серебряная Свадьба»; **Андрусь Такінданг**, спявак, і гурт «Recha»; **Ганна Хітрык**, акцёрка, і гурт «Дети Детей»; **Зміцер Сасноўскі**, лідэр гурту «Стары Ольса» ды іншыя.

# З Лявонава знялі ўсе абвінавачанні

З былога палітвязня, ваўкавыскага прадпрымальніка Юрыя Лявонава знялі ўсе абвінавачанні ў падпале. Пастанову аб прыпыненні справы Лявонава падпісаў следчы з Галоўнай управы па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю Міністэрства ўнутраных справаў Віктар Клачко. Лявонаву паведамілі, што супраць яго заводзілася справа ў сувязі з тым, што ён нібыта ведаў пра падрыхтоўку нейкага злачынства, але не паведаміў. Аднак праз даўнасць часу — ад тых падзей мінула болей за 2 гады — гэтую справу таксама закрылі.

Былы начальнік Лявонава Мікалай Аўтуховіч і іхні прыяцель Уладзімір Асіпенка застаюцца ў турме.

«Недаказанасць удзелу ў злачынстве аднаго з фігурантаў справы дае шанцы і астатнім на тое, што іх удзел таксама не будзе даказаны», кажа Лявонаў.

Ён не выключыў, што яму прыйдзецца быць на судзе над Аўтуховічам і Асіпенкам сведкам.

**Паводле радыё «Свабода»**

Артыкул Юрыя Лявонава «Як судзілі Аўтуховіча» — старонка 7.

## Мядзведзеў назіраў за вызваленнем блакаднага Калінінграду



**Пад Баранавічамі скончыліся беларуска-расійскія манеўры «Захад-2009». Іх апафеозам стаў контрудар па умоўным праціўніку. Згодна са сцэнаром, войскі прарваліся на дапамогу «блакаднаму Калінінграду», а затым і аваладалі балтыйскім плацдармам. У Вільні, Рызе, Таліне, Варшаве за вайсковымі гульнямі сачылі з трывогай. На фота: назіраць за манеўрамі ў Калінінград і Баранавічы прылятаў прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў.**

## СЦІСЛА

### Дарафеева не прыжылася

Толькі год голас Ірыны Дарафеевай спяваў маленькім беларусам у перадачы «Калыханка» на «Ладзе». Дырэкцыя тэлеканала хоча вярнуцца да старое добрае песні на верш Генадзя Бураўкіна і музыку Васіля Раінчыка.

### Зняцце кватэраў патаннела

Цана арэнды стандартных аднапакаёвак у сталіцы цяпер вагаецца ў межах 200 даляраў плюс квартплата. У найлепшых месцах уздоўж першай лініі метро кватэры каштуюць сёння да $250.

### Заяўку на візу можна падаць праз інтэрнэт

Такую новую паслугу прапануе пасольства Літвы. Дзякуючы гэтаму, можна будзе не стаяць у чарзе каля пасольства.

### Тэлефоны з беларускай мовай меню

У продажы з'явіліся мабільныя тэлефоны Nokia з беларускай лакалізацыяй. Яна ёсць у мадэлях 5030 і 1661. Хутка дададуцца і іншыя варыянты.

### У Швецыі мяняюць афіцыйную назву Беларусі

Раней выкарыстоўваліся два назовы «Belarus» і «Vitryssland». Апошняя была калькай з «Ryssland». Цяпер «Vitryssland» выключаюць з нарматываў, бо яна прыніжае суверэнітэт Беларусі.

**МБ; АП**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| | | | |
|---|---|---|---|
| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | Дата | Сума |
|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | |

Касір

Агулам

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| | | | |
|---|---|---|---|
| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | Дата | Сума |
|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | |

Касір М.П.

Агулам

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazu дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй за ахвяраванні

В.Л. са Смаргонскага раёна.
Адзе Р. з Шаркаўшчынскага раёна.
М.Н. з Мінскага раёна.
Уладзіміру М. з Гомельскага раёна.
Андрэю Н., М.Б. з Полацка.
Антону Т. са Смалявіцкага раёна.
Міхаілу М., В.В. са Стаўбцоўскага раёна.
Уладзіміру С., В.Б., Анатолю Л. з Гомеля.
Міхаілу Ш. з Брэста.
Алегу Р. з Полацкага раёна.
Ж.П. з Віцебска.
Паўлу С. з Горацкага раёна.
В.В., Н.Б., Г.Л., Генадзю К. з Гродна.
В.А. з Магілёва.
Аляксандру П. са Жлобінскага раёна.
Аляксандру Р., А.К., Таццяне М. з Баранавіцкага раёна.
Уладзіміру Д. з Барысаўскага раёна.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# «...не мост і не шлюз»

Патрыярх Маскоўскі: «Гістарычная Русь падзеленая на суверэнныя дзяржавы. Так захацеў народ, і, мусіць, такая задума і Божага промыслу».

**Патрыярх Кірыла**

(свецкае імя Уладзімір Гундзяеў) нарадзіўся ў 1946 у Ленінградзе ў сям'і святара. Па сканчэнні школы паступіў у Ленінградскую духоўную семінарыю, а потым — Акадэмію, якую скончыў у 1970. Працаваў выкладчыкам дагматычнага багаслоўя ў ЛДАіС, адначасова — асабісты сакратар мітрапаліта Ленінградскага Мікадзіма.

Ад 1971 па 1974 — прадстаўнік Маскоўскага патрыярхату пры Сусветнай Радзе Цэркваў у Жэневе. Ад 1974 па 1984 — рэктар ЛДАіС. Ад снежня 1984 — архіепіскап Смаленскі і Вяземскі. Ад 1988 — архіепіскап Смаленскі і Калінінградскі. 25 лютага 1991 узведзены ў сан мітрапаліта.

Мітрапаліт Кірыл любіць і ўмее выступаць публічна. Доўгі час вёў праграму на ТВ.

Працяг са старонкі 1.

Беларусь размешчана паміж Расіяй і заходнім светам і з'яўляецца часткай праваслаўнай цывілізацыі. Беларусь — гэта ніякі не мост, ніякі не шлюз. Разважаючы іначай, можна дайсці да таго, што масты і шлюзы будуць усходней Смаленска.

### Горкія кветкі

Дазвольце працытаваць цудоўныя словы беларускага паэта Максіма Багдановіча: «Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак». Такі лёс Беларусі. І з горкіх кветак, з горкіх зёлак — гэтых канфліктаў міждзяржаўных, міжцывілізацыйных — народ, натхнёны Царквой сваёй, арыентаваны на сапраўдную сістэму каштоўнасцей, умеў збіраць мёд.

### Скарына не піцерскі

Цудоўны ўнёсак у сферу народнай асветы беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны. Бо дзякуючы ягоным намаганням, беларусы аднымі з першых у Еўропе, яшчэ ў 1517 — 1519 гадах, атрымалі сваю друкаваную Біблію.

### Курапаты і Хатынь

У сярэдзіне мінулага стагоддзя ўсяму свету сталі вядомыя назвы, дагэтуль непрыкметныя на беларускай зямлі. Я маю на ўвазе ўрочышча Курапаты пад Мінскам, дзе багаборчымі ўладамі былі бязвінна расстраляныя дзесяткі тысяч людзей, і Хатынь, што сімвалізуе 136 беларускіх вёсак, спаленых нацыстамі і іх памагатымі разам з жыхарамі.

### Катастрофа СССР

Трагічную гісторыю ХХ стагоддзя дапоўнілі катастрафічныя рэаліі пачатку 1990-х гадоў. Распад СССР не толькі дэстабілізаваў сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё ўваходзячых у яго рэспублік, але і ледзь не стаў прычынай узнікнення варажнечы паміж братнімі славянскімі народамі. Аднак кіраўнікам Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь удалося выправіць сітуацыю і прыняць лёсавызначальнае рашэнне пра стварэнне саюза дзвюх дзяржаваў.

### Бласлаўляецца!

І сёння мне хацелася б заклікаць усіх палітыкаў і ўсе нашыя эліты і ў Расіі, і ў Беларусі: даражыце гэтым саюзам, створаным у згодзе з народнай воляй, з нашай згодай, які бласлаўляецца Праваслаўнай Царквой! Памятайце пра тое, што ніякія меркаванні дробязнай палітычнай і эканамічнай выгады не могуць быць пастаўленыя побач з нашай векавой і супольнай гісторыяй і нашай супольнай будучыняй. Пры гэтым мы павінны цудоўна разумець, што існуюць суверэнітэты дзяржаваў, мы павінны паважаць суверэнітэт кожнай з рэспублік былога Саюза.

### Скажоны поспех

Мы не можам не заўважаць таго, што ва ўсім у свеце адбываюцца спробы змяніць чалавечую свядомасць.

Паняцце паспяховасці, папулярнае ў моладзевым асяродку, выкарыстоўваецца нядобрасумленнымі людзьмі для прыкрыцця сваіх эканамічных і палітычных інтарэсаў. Калі б папярэднія пакаленні беларусаў былі паспяховымі ў сучасным, скажоным сэнсе гэтага слова, то хто ведае, ці знайшліся б у беларускага народа сілы адужаць усе гэтыя гістарычныя выпрабаванні, ці захавалася б Беларусь?

### Стрымліваць і самадысцыплінаваць

Не можа быць паспяховым чалавек, які дасягае чагосьці коштам паламаных лёсаў іншых людзей. Нельга ісці да дасягнення мэты па трупах або жорстка расштурхоўваючы канкурэнтаў локцямі.

Без такога самаабмежавання і ўліку інтарэсаў бліжняга развіццё добрых адносінаў паміж людзьмі немагчымае. Самы яскравы прыклад — сям'я. Калі муж перастае сябе абмяжоўваць, стрымліваць і самадысцыплінаваць у імя жонкі і дзяцей, што тады адбываецца? Калі раптам жонка губляе здольнасць да самадысцыпліны і абмежавання сябе ў імя сваёй сям'і, сям'я разбураецца. Гэтаксама разбураецца і грамадства, гэтаксама разбураецца і дзяржава.

**Пераклад паводле Church.by**

«Калі ўслед за з'яўленнем суверэнных дзяржаваў будзе бурыцца адзінства царквы — от тады мы чыніцьмем ліхую і Богу няўгодную справу».

## КАМЕНТАРЫ

### Наталля Васілевіч: Патрыярх узяў рэванш у Лукашэнкі

Рэдактарка партала «Царква», актывістка Сусветнага брацтва праваслаўнай моладзі «Сіндэсмас»: «У пытаннях сталінскіх рэпрэсій патрыярх вельмі прынцыповы, таму ён і згадаў пра Курапаты. Важна адзначыць, дзе прагучалі гэтыя словы. Лукашэнка прыязджае ў Кафедральны сабор і прамаўляе з месца епіскапа, прычым часам супрацьлеглае таму, што кажа Царква. Кірыл гаварыў пра Курапаты з трыбуны ў Палацы Рэспублікі, адкуль звычайна звяртаецца Лукашэнка. Гэта своеасаблівы рэванш».

**Запісаў СП**

### «Салідарнасць»: Аплявуха Лукашэнку

Сустрэча кіраўніка Беларусі з Патрыярхам прайшла ў «цёплай сяброўскай атмасферы». Але на адну з ініцыятываў Лукашэнкі кіраўнік РПЦ адрэагаваў вельмі рэзка. Як вядома, кіраўнік Беларусі выступіў з ініцыятывай сустрэчы Патрыярха з Папам у нашай краіне.

Адказ госця аказаўся ашаламляльным. Кірылу нічога не каштавала дыпламатычна зманеўраваць, заявіць, што ён высока цэніць старанні кіраўніка Беларусі. У крайнім выпадку, можна было сказаць нешта нейтральнае, накшталт «на ўсё воля Божая». Але... «Пра гэтыя высілкі я нічога не ведаю», — адрэзаў Патрыярх.

**Gazetaby.com**

### Ян Максімюк: Патрыярх здзівіў многіх

Усе папскія паездкі пераначасычаныя літургіямі і маленнямі, у якіх Папа прапаведуе і тлумачыць слова Божае. Ватыкан ніколі не дазваляе, каб сацыяльна-палітычнае вымярэнне паездак узяло верх над рэлігійным.

Патрыярх жа ў Мінску не правёў ніякага богаслужэння. Ён наведаў епархіяльную ўправу і сабор, сустрэўся з прэзідэнтам ды ўзяў удзел у спатканні «з грамадскасцю» і канцэрце ў Палацы Рэспублікі. Чым не візіт свецкага палітыка?

Патрыярх здзівіў многіх, калі сказаў, што «сімвалам пакутаў Беларусі з'яўляюцца ўрочышча Курапаты і вёска Хатынь».

Упершыню з вуснаў такога высокага саноўніка прагучала слова «Курапаты».

Працытаваўшы Максіма Багдановіча і Якуба Коласа — хто з праваслаўных епіскапаў Беларускага экзархату РПЦ здольны на гэтае?! — у астатнім патрыярх застаўся неадродным сынам маскоўскай гістарычнай традыцыі, якая ніколі не лічыла Беларусь нечым сапраўды асобным ад Расіі. Ён пабагаславіў пабудову «Саюза Расіі і Беларусі» ў трохадзінстве «Святой Русі».

**З блога на радыё «Свабода»**

### Барыс Тумар: Новы расійскі Нікан

З трыбуны Палацу прамаўляў новы расійскі Нікан — патрыярх, які ўладарна ўмешваецца ў палітыку. Праваслаўная інтэлігенцыя адчувала справядлівы гонар за такога ўладыку. Расійскае праваслаўе ўваскрэсла па савецкім патаптанні і пятроўскім паніжэнні.

Аднак прыцягальнасць такога праваслаўя для беларускіх палітычных элітаў невысокая.

Лукашэнкаў рэжым не церпіць аўтаномных цэнтраў улады. У той жа час імперская складовая РПЦ заўжды будзе насцярожваць еўрапейскую частку беларускіх элітаў, нават калі інтэлектуалізм патрыярха і імпануе.

# Хмарачосы схаваліся

**Архітэктурная выстава «Мінск–2009» засведчыла, што амбітныя архітэктурныя праекты апошніх гадоў як мінімум адкладаюцца.**

### Дзе «Мінск-Сіці»?

Галоўная сенсацыя была звязана з «Мінск-Сіці». Самы гучны архітэктурны праект сталіцы аказаўся ўвогуле не прадстаўлены на выставе. Нягледзячы на гэта, у Камітэце па архітэктуры і горадабудаўніцтве Мінгарвыканкама пераконваюць: не хвалюйцеся, «Мінск-Сіці» ніхто не адмяняў. Але апошнім часам пра расійскую нафтагазавую кампанію «Ітэра» — асноўнага інвестара — кажуць ці дрэнна, ці нічога. На выставе не сказалі нічога.

Не было і праекта ітэраўскіх хмарачосаў на вуліцы Танка. Больш за тое, на месцы, дзе яны меліся з'явіцца, анансаваны... іншы праект! Таксама бізнэс-цэнтр, але не 54-павярховы, нашмат ніжэйшы.

**У Мінску збіраюцца будаваць 20 бізнэс-цэнтраў. Святое месца пустым не будзе?**



Беларуськалій. Пір у час чумы.



Чаго беларусы могуць не пабачыць — гатэль «Кемпінскі».



Дзе будуць адбывацца апазіцыйныя акцыі? — новае аблічча парку каля плошчы Бангалор.



Вежы на Танка таксама не паўстануць.



Каралеўства хайтэку — будучы «Белгазпрамбанк».

### Без «Кемпінскі»

Праекты, пра будаўніцтва якіх гучна расказвалі раней, а цяпер маўчаць, выклікаюць вялікую цікавасць. Узвядзенне пяцізоркавага гатэля «Кемпінскі» вышынёй 35 паверхаў каля Кастрычніцкай плошчы адкладзенае на чатыры гады. Выходзіць, гатэль паўстане толькі ў 2015 годзе. Але ўжо за год да гэтага ён павінен прымаць элітных гасцей з Міжнароднай федэрацыі хакея! Прынамсі, так абяцалі Навумаў з Лукашэнкам. Імаверна, што на «пяцізоркавым» месцы ўзнікне сяміпавярховы адміністратыўны будынак.

Блогер darriuss, знаўца ўсіх будаўнічых праектаў сталіцы, слаба верыць у інвестыцыйныя перспектывы Мінска. «Насамрэч будзе пабудавана максімум 30-40 адсоткаў з анансаванага. І тое ў асноўным за кошт дзяржаўных праектаў», — мяркуе ён.

### І муляж Навагрудскага замка

У замежных турыстаў можа з'явіцца яшчэ адно месца, дзе можна будзе пабачыць, як выглядаў беларускі побыт раней. Цяпер яны змогуць нават не выязджаць за межы Мінска. На выставе быў прадстаўлены праект этнакультурнага цэнтра «Беларуская спадчына», які маюць пабудаваць у Чыжоўцы. Будуць узведзеныя драўляная крэпасць, муляж Навагрудскага замка, ратушная плошча, панскія маёнткі, сялянскія хаты... Паводле апісання, тут будуць адбывацца рыцарскія турніры, можна будзе паспрабаваць стравы нацыянальнай кухні ці паўдзельнічаць у старадаўніх рытуалах.

### Храмаў пабольшае

Не спыняецца і будаўніцтва цэркваў. Непадалёк ад Трактарнага завода з'явіцца, сімвалічна, царква іконы «Неўпівальная чаша». Праект «царкву — у кожны спальны раён» працягнецца ўзвядзеннем Богаяўленскага храма ў Лошыцы. Тамсама пабудуюць і касцёл Маці Божай Ружанцовай. Калі праваслаўных храмаў у Мінску досыць шмат, дык будаўніцтва кожнага новага каталіцкага — пакуль хутчэй выключэнне, чым правіла.

### Мінску не хапае гольф-клуба

Ад пабудоваў для душы — да пабудоваў для цела. Апроч «Мінск-арэны» на 15 тысяч глядацкіх месцаў, пабудуюць гандбольны палац на вуліцы Гарэцкага, на Скарыны з'явіцца тэнісны цэнтр. Будзе і лёгкаатлетычны манеж Універсітэта фізкультуры. Хапае і экзотыкі. Напрыклад, у Калодзішчах збіраюцца будаваць палі для гольф-клуба.

Свой спартыўна-аздараўленчы комплекс праектуе «Беларуская калійная кампанія». І гэта ў дадатак да шыкоўнай штаб-кватэры. Не хочацца менеджэрам працаваць у Салігорску, калі зусім блізка ёсць двухмільённы горад?

**Ягор Марціновіч**

## У 2010-м інфляцыя захаваецца на сёлетнім роўні

Праект бюджэту на 2010 год фармаваўся зыходзячы з росту інфляцыі на 9% і росту ВУП на 2%. Пра гэта паведаміў міністр фінансаў Андрэй Харкавец на пасяджэнні Саўміна 26 верасня.

Дакумент прадугледжвае рэалізацыю шэрагу мер падатковага характару, што «прыводзіць да скарачэння рэсурсаў бюджэту на 2,3 трлн. рублёў». «Для частковага кампенсавання стратаў прапаноўваецца павысіць стаўку ПДК з 18 да 20%».

**БелаПАН**

## СЦІСЛА

### Пракаповіч абяцае ніякай дэвальвацыі

Ваганне курса рубля да кошыка валют у 2010 г. запланавана на ўзроўні +/–5%. Пра гэта паведаміў кіраўнік Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.

### Купіце «Нафтан»!

«Калі ў вас ёсць грошы і жаданне, прыязджайце, я гатовы падтрымаць праграму па прыватызацыі беларускага нафтаперапрацоўчага аб'яднання», — заявіў Лукашэнка на беларуска-літоўскім форуме ў Вільні. Ён дадаў, што ацэньвае прадпрыемства ў суму каля $3 мільярдаў.

### Самыя дарагія брэнды свету

Першае месца захавала кампанія Coca-Cola. Яе кошт павялічыўся на 3% і дасягнуў $68,7 млрд. Далей ідуць кампутарныя гіганты IBM, які каштуе $60 млрд, і Microsoft ($56,5 млрд). У пяцёрцы яшчэ General Electric ($47,8 млрд) і Nokia ($34,9 млрд).

### Расія прадала «МіГ» за 90 беларускіх рублёў

Кошт 100% акцый расійскай самалётабудаўнічай кампаніі «МіГ», якая належала дзяржаве, склаў 1 рубель і 5 капеек. Настолькі нізкі кошт тлумачыцца аб'ёмам даўгоў прадпрыемства. У канцы мінулага года ён складаў $1,5 млрд.

### Чавес хоча калгасы

Прэзідэнт Венесуэлы прапанаваў стварыць калгасы для пад'ёму сельскагаспадарчай вытворчасці. Ён нагадаў, што «калгасы былі створаныя ў савецкія часы» і на сёння працягваюць «паспяхова працаваць» у Беларусі, якую ён нядаўна наведаў.

### Расія пераносіць перапіс

З наступнага года перапіс перанеслі на 2013 год. Прычына — крызіс. Расіі не хапае $320 мільёнаў на правядзенне кампаніі. З іх $290 мільёнаў трэба было выдаткаваць на заробак перапісчыкам.

### У нас на раёне... свая валюта

У лонданскім раёне Брыкстон створана спецыяльная валюта, брыкстонскі фунт. Па наміналу ён роўны аднаму брытанскаму фунту стэрлінгаў. Увядзенне новых грошай мела на мэце стымуляваць продаж прадукцыі, выпушчанай кампаніямі раёна. Пры яго выкарыстанні пакупнікі атрымліваюць зніжкі.

**ЯМ**

# Гарэў «Новы свет»

**24 верасня ў Гродне здарыўся незвычайны пажар.**

Згарэў помнік драўлянай архітэктуры 1912 года.

Жылы 10-кватэрны дом №8 на вуліцы 17 верасня ў Гродне ўспыхнуў нібыта ў выніку перагрузкі электраправодкі. На дадачу, выбухнуў балон з газам. У доме заставалася каля дзесятка цэлых балонаў, таму міліцыя ачапіла тэрыторыю. На тушэнне пажару выклікалі нават «невыязную» пажарную частку завода «Азот». І не дзіва – гэты квартал забудаваны пераважна драўлянымі дамкамі. На шчасце, ніхто з жыхароў дома не пацярпеў. У агні згарэў толькі сабака.



Пажар у «Новым свеце» прыцягнуў увагу грамадскасці. За гэты раён неабыякавыя гродзенцы не першы год змагаюцца з уладамі. Дом №8, як і шэраг іншых, меркавалі знесці, каб забудаваць раён сучаснымі дамамі.

**Сямён Печанко**

# У Беларусь можа завітаць грып з Аўстраліі

**Імавернасць прыходу «Брысбена» высокая, кажуць у Міністэрстве аховы здароўя.**

Вакцынацыя супраць грыпу ў Беларусі сёлета пачалася раней, чым летась. Платная пачалася 22 верасня, а з сярэдзіны кастрычніка бясплатна прышчэпяць школьнікаў, дашкольнікаў, а таксама работнікаў, якія забяспечваюць жыццядзейнасць горада — усяго больш за 80 тыс. чалавек.

Пачатак вакцынацыі ў Беларусі супаў з публікацыямі пра магчымую хвалю віруса грыпу «Брысбен» з Аўстраліі. Гэты вірус выклікае вельмі высокую тэмпературу і агульную інтаксікацыю арганізма.

Варта адзначыць, што прэпараты, якія набываюцца нашай дзяржавай дзеля гэтых мэтаў, утрымліваюць штам віруса «Брысбен». На эпідэміялагічны сезон 2009-2010 гг. у грыпозныя вакцыны экспертамі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя вызначаныя штамы віруса А (A/Brisbane/2007/H1N1, A/Brisbane/2007/H3N2) і віруса В (B/Brisbane/2007), паведаміў галоўны доктар Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя В.Грынь. У Беларусі будуць выкарыстоўвацца вакцыны, якія ўтрымліваюць рэкамендаваныя САЗ штамы віруса: «Інфлювак» (краіна-вытворца Бельгія), «Ваксігрып» (Францыя), «Грыпол плюс» (Расія), «Флюарыкс» (Германія). Імавернасць прыходу «Брысбена» высокая, кажуць у Міністэрстве аховы здароўя.

У мінскіх медцэнтрах цэны на вакцыны знаходзяцца ў межах 50-60 тыс. рублёў. Аднак памятайце, што дзеці, хранічна хворыя і іншыя ўразлівыя групы маюць права на бясплатную вакцынацыю.

**Сямён Печанко**

# Другім чалавекам у Нямеччыне стане гей

На выбарах у Нямеччыне, што прайшлі 27 верасня, перамог блок Хрысціянска-дэмакратычны саюз / Хрысціянска-сацыяльны саюз (ХДС/ХСС). Сацыял-дэмакраты атрымалі найгоршы вынік у сваёй пасляваеннай гісторыі.

Ангела Меркель абвясціла пра стварэнне кааліцыі ХДС/ХСС і Свабоднай дэмакратычнай партыі (СвДП). СвДП — гэта ліберальная партыя, якая адстойвае інтарэсы бізнэс-колаў.



**Гіда Вэстэрвэле зойме пасаду віцэ-канцлера.**

Такім чынам, другім чалавекам ва ўрадзе ўпершыню стане гей — лідэр Свабодных дэмакратаў Гіда Вэстэрвэле.

У новым парламенце кааліцыя ХДС/ХСС і СвДП будзе валодаць упэўненай большасцю. Можна чакаць, што новы ўрад Нямеччыны будзе дзейнічаць у цесным саюзе з ЗША на міжнароднай арэне. Сацыял-дэмакраты выступаюць за цяснейшыя сувязі Германіі з Расіяй. Для Меркель пытанні правоў чалавека маюць большае значэнне.

**Мікола Бугай**

# Чарнобыльская рызыка

**Міжнародны чарнобыльскі рух скалыхнуў скандал, звязаны з непрыстойнымі паводзінамі яго ных актывістаў.**

Сакратар дабрачыннай ініцыятывы «Chernobyl Children Lifeline Charity» ў шатландскім мястэчку Інвернес Алан Уілсан асуджаны на чатыры гады за сэксуальны гвалт над трыма хлопчыкамі.

### Замежнікі-педафілы

Уілсан меў рэпутацыю добрага мужа і бацькі двух дзяцей. Ён прызнаў пяць выстаўленых супраць яго абвінавачанняў, якія тычыліся непрыстойных дзеянняў і сэксуальнага гвалту ў дачыненні да непаўналетніх. Усе гэтыя дзеці — з Інвернеса. Беларускія дзеці, якіх адпраўляюць на аздараўленне за межы краіны, ад яго нібыта не пацярпелі.

Як заявіў на судзе кіраўнік «Chernobyl Children Lifeline Charity», актывісты гэтай арганізацыі правялі ўласнае расследаванне і ўпэўненыя, што беларускія дзеці падобнага абыходжання не зазналі.

Як перадае радыё «Свабода», скандал вакол непрыстойных дзеянняў Алана Уілсана — не першы з тых, якія закранулі міжнародны чарнобыльскі рух.

Пазалетась у Ірландыі быў асуджаны 52-гадовы валанцёр чарнобыльскага фонду Джон Пэпард за парнаграфічныя здымкі непаўналетніх дзяцей з Гомельшчыны.

А на пачатку гэтага месяца пракуратура Бадэн-Вюртэмберга абвінаваціла 56-гадовага дэпутата Бундэстага Ёрга Таўса ў захоўванні і распаўсюджванні дзіцячай парнаграфіі. Дэпутат гэты добра вядомы ў дабрачынных чарнобыльскіх колах Беларусі.

### Цяжкасці перакладу

Пракурорскія праверкі ў Беларусі рэгулярна выяўляюць парушэнні заканадаўства ў сферы абароны дзяцей. Аднак гэта датычыць пераважна ўсынаўлення замежнікамі. Парушэнні тычыліся афармлення дакументаў, неабходных для рашэння судом пытання аб усынаўленні. Рэзанансу ў грамадстве гэтыя выпадкі не выклікалі, бо дэталі справаў не агучваліся пракуратурай. Шум выклікалі іншыя справы, такія як справа Вікі Мароз і Тані Казыра — сіротак, якія не хацелі вяртацца дамоў з-за мяжы.

### Афіцыйна

Мы звярнуліся ў гомельскі дабрачынны фонд «Дапамога дзецям Чарнобыля» з пытаннем, ці чулі яны пра выпадкі гвалту над дзецьмі, і як ажыццяўляецца іх бяспека з улікам такіх выпадкаў.

«Не ведаем нічога пра такія выпадкі, напэўна, гэта былі адзінкавыя прэцэдэнты. Чаму не напісаць пра добрае, пра тое, што дзеці аздараўляюцца? — спалохана адказалі ў фондзе. — Мы трымаем справаздачу перад Дэпартаментам па гуманітарнай дзейнасці, такія справы павінны разглядацца ў іх. Мы можам вам распавесці пра добры бок, навошта пісаць пра кепскае?»

У Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справаў прэзідэнта РБ таксама нічога не чулі. Кіраўнік сектара аздараўлення Лідзія Ізюмава адказала, што ўся бяспека дзяцей знаходзіцца выключна пад кантролем Указа №555. «Вываз дзяцей забяспечваецца толькі пры наяўнасці дамоваў. Зараз у нас заключана 9 дамоваў з іншымі краінамі», — адзначыла яна.

**Вольга Жарнасек**

# Еўракамісія аказвае Беларусі падтрымку ў барацьбе супраць гандлю людзьмі

За апошнія дзесяць гадоў больш за 3000 беларусаў сталі ахвярамі гандлю людзьмі, з іх 400 — дзеці. З мэтай супрацьдзеяння гэтаму ў Беларусі стартаваў сумесны праект Еўрапейскага Саюза, праграмы развіцця ААН, МУС Беларусі і дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ «Папярэджанне, барацьба і мінімізацыя сацыяльных наступстваў у вобласці гандлю людзьмі ў Рэспубліцы Беларусь». Еўрапейская Камісія, ААН і дзіцячы фонд ААН ЮНІСЕФ выдаткавалі на яго 1 мільён 334 тысячы 550 еўра.

Беспрацоўе з'яўляецца асноўнай прычынай развіцця гандлю людзьмі сярод моладзі. Спробы працаўладкавання за мяжой могуць прывесці ў нерат «гандляроў рабамі». З мэтай барацьбы з беспрацоўем сумесна з Мінгарвыканкамам будзе створана самая поўная база вакансій.

Адсутнасць грошай часта вымушае жанчын ехаць на заробкі за мяжу. Таму ў рамках праекта для жанчын будуць арганізаваныя бізнэс-курсы, а таксама аказаная дапамога ў арганізацыі ўласнага бізнэсу. Эксперымент пачнуць у адным з раёнаў Брэсцкай вобласці.

Грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын» з дапамогай праграмы ЕС утрымлівае ў Мінску прытулак для рэабілітацыі жанчын, якія пацярпелі ад гандлю людзьмі. У прытулку могуць жыць чатыры жанчыны, нават з дзецьмі. Гэта кватэра з усімі ўмовамі для камфортнага пражывання. З пацярпелымі там працуюць спецыялісты, бо і пасля вяртання многія сутыкаюцца з вялізнай колькасцю праблем.

— Ты думаеш, што едзеш мыць посуд, а там забіраюць дакументы і пачынаюць псіхалагічны ціск. Гавораць, што ты вінен шмат грошай за пераезд, за афармленне. У злачынцаў працуюць псіхолагі, якія ламаюць псіхіку, і чалавек не можа ўцячы, — распавядае кіраўнік «Асацыяцыі» Галіна Цюрына. — А бывае і горш. Не хачу палохаць, але некалькі гадоў таму мы вярталі з Германіі трупы трох жанчын.

Каб пазбегнуць кепскіх наступстваў, варта перад выездам кансультавацца са спецыялістамі. У Беларусі гэта можна зрабіць па тэлефоне бясплатнай гарачай лініі Ла Страда, арганізаванай «Асацыяцыяй маладых хрысціянскіх жанчын». Ад 9 да 21-й без выходных можна бясплатна пазваніць на лінію з любога тэлефона ў Беларусі: 8-801-100-88-01.

Спецыялісты «Асацыяцыі» карыстаюцца базамі дадзеных замежных фірм. Яны могуць праверыць правільнасць складання кантракта і надзейнасць працадаўцы.

А вось з замежнымі жаніхамі — складаней, на іх няма базы дадзеных. Аднак ёсць спосабы праверыць сур'ёзнасць намераў.

Асаблівая ўвага праграмы звернутая на гандаль дзецьмі. Яны найбольш неабароненыя перад злачынцамі. Калі дарослыя трапляюць у рабства падманным шляхам, то гандаль дзецьмі заўсёды звязаны з фізічным гвалтам.

Сумесна з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) запланаваныя трэнінгі і курсы павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў і сацыяльных педагогаў.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# «Міс» палітычнага значэння

Апошнія тыдні па Беларусі ў рамках чарговага конкурсу прыгажосці «Міс Інтэркантыненталь» вазілі 50 прыгажуняў. І ў Салігорск на шахты, і ў Дудуткі на самагонку. У Мінск жа прывезлі карону з дыяментамі за $360 тысяч, якую далі памераць пераможцы. І ўсё для таго, каб, паведамляюць арганізатары, «стварыць прывабны вобраз краіны ў свеце». Настаўніцы з заробкам 600 тысяч рублёў і даяркі з заробкам 400 тысяч рублёў шчыра радаваліся відовішчам.

**Сяргей Мікулевіч**

**Вынікі конкурсу маюць тонкае палітычнае значэнне. Уладальніцай тытула «Міс Інтэркантыненталь 2009» стала прадстаўніца Венесуэлы Ханелі Куэнтэра Ледзма. Беларуска Марыя Есьман заняла 2-е месца. А ў фінал прапусцілі таксама ўдзельніцу ад Польшчы.**

# АНТ арганізавала курсы беларускай мовы

**Адмысловая праграма ідзе ў эфіры «Нашага ранку». Вядуць праграму спявак Андрусь Такінданг ды намесніца старшыні ТБМ Алена Анісім.**

Вядучы Валер Кашчэеў кажа, што, згодна з дасьледаваньнямі Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі прэзідэнта, па-беларуску пастаянна гавораць 12% насельніцтва.

«Большасць гаворыць па-расійску, значны працэнт — ужываючы беларускія і расійскія словы», — дадае Люся Лушчык.

«А ці ведаеце вы, што такое ровар?» — пытаецца спадар Кашчэеў. І пачынаецца перадача Такінданга.

Спявак глядзіцца ў кадры стыльна і натуральна. Ён патлумачыў, што азначаюць словы ровар і імбрычак, потым Алена Анісім распавяла, дзе і калі гэтыя словы ўжываюцца.

Перадача пакідае пазітыўнае ўражанне, дзякуючы харызме і нязмушанасці сп. Такінданга — беларускамоўнага рокера.

**Мікалай Гарбацэвіч**

# «Дзень без аўто»: П'яны кіроўца збіў жанчыну насмерць


ONLINER.BY

ДТЗ адбылося ў Мінску на перасячэньні Кальварыйскай і Гусоўскага. 60-гадовая жанчына пераходзіла вуліцу на зялёнае сьвятло. У гэты момант з боку праспекта Пушкіна на чырвонае сьвятло рухаўся легкавік «Опель».

Ён збіў жанчыну. Пры гэтым аўто не спынілася і ўдарылася ў «Фальксваген», у якім ехала сям'я. Кіроўца і пасажыры пратараненага легкавіка атрымалі няцяжкія траўмы.

**Onliner.by**

# Свінарка ідзе ў прэзідэнты Украіны

Партыя «Сялянская Украіна» мае вылучыць кандыдатам у прэзідэнты свінарку Лідзію Вона.

«Лідзія Вона — вельмі сімпатычная, сціплая, мілая жанчына са славянскім абліччам і 6-м памерам грудзей, ёй 38 гадоў», — заявіў лідэр гэтай мікраскапічнае партыі.

Лідзія працуе ў КСП «Іршыкі» (Хмяльніцкая вобласьць).

«Наш асноўны канкурэнт — Юлія Цімашэнка, — зазначае лідэр «СУ». — Дзве жанчыны — надта сур'ёзны двубой будзе, але мы ведаем, што пераможа Вона, бо яна і не ў такіх свінарніках парадак наводзіла».

Сама Лідзія Вона пацьвердзіла, што зьбіраецца балатавацца ў прэзідэнты, але яшчэ «пакуль думае».

Галоўная кандыдатка на пасаду прэзідэнта, Юлія Цімашэнка, рэкламуе сябе білбордамі: «Вони розмовляють — вона працює» (Яны размаўляюць — яна працуе). Канкурэнтам тэрмінова спатрэбілася парадыйная «Вона».

**АГ**



## ЗДАРЭННІ

### Збег зьлачынца — асудзілі начальніка канваіраў

Судом Барысаўскага раёна асуджаны кіраўнік ізалятара часовага ўтрымання Жодзінскага ГУУС, які канваяваў Сяргея Багдашова. Кіраўніку ІЧУ прызначана пакаранне ў выглядзе чатырох гадоў «хіміі». Ён абвінавачваўся паводле ч.1 арт. 428 КК за халатнасьць.

Нагадаем, што 31-гадовы Сяргей Багдашоў 29 мая ўцёк з залы суда, дзе яго судзілі за рабаўніцтва. Да гэтай пары зьлачынца не знойдзены.

### Трагедыя на МТЗ

Работніца Мінскага трактарнага завода загінула ад апёкаў расплаўленым металам. Трагедыя здарылася на плавільным участку ліцейнага цэха №2. Вазок, у якім быў расплаўлены метал, з'ехаў з рэйкі і перакуліўся. Машыніст вазка атрымала 100% апёкаў цела 3-4 ступені і памерла ў бальніцы.

### Упала з восьмага паверха і засталася жывая

31-гадовая жыхарка Рэчыцы ўпала з восьмага паверха. Рэдкае шчасьце: яна выжыла, трапіўшы на балкон да суседзяў. Як высьветлілася, жанчына з сяброўкай выходзіла на балкон пакурыць. Нахіліўшыся наперад, яна страціла раўнавагу і перакулілася праз поручы. У МНС не могуць патлумачыць, як жанчына магла патрапіць на балкон і чаму яна не ўпала на зямлю.

### Тэлефонныя тэрарысты

За верасень школьнікі двойчы лжэмініравалі офіс кампаніі «Velcom». У першым выпадку ў службу даведкі патэлефанаваў 12-гадовы шасьцікласьнік з пасёлка Зарэчча Рэчыцкага раёна. У другі раз ілжэтэрарыстам стаў 14-гадовы жыхар Быхава.

**ВЖ**

# Як судзілі Аўтуховіча

**Гэта — расповед ад першай асобы пра канфлікт прадпрымальніка і дзяржавы, які набыў вялікі розгалас у краіне. Пра акалічнасці першай справы Мікалая Аўтуховіча піша Юры Лявонаў.**

Перада мной — дзесяць важкіх тамоў з матэрыяламі падатковых праверак і гаспадарчых судоў прадпрыемства «Ніка-Транс» і прадпрымальніка Аўтуховіча. Шэсць тамоў з матэрыяламі крымінальнай справы знаходзяцца ў судзе Кастрычніцкага раёна Гродна. У гэтых папках — тры з паловай гады барацьбы Мікалая Аўтуховіча за права займацца бізнэсам.

Першы дакумент датаваны 30 красавіка 2003 г., апошні — 10 студзеня 2007 г. Пасля таго як 6 ліпеня 2006 г. прагучаў прысуд, Аўтуховіч працягваў даводзіць сваю праවату — скаргамі ў касацыйныя інстанцыі. Першая падатковая праверка датавана 1 ліпеня 2003 года. Тры гады жыцця былі поўныя праверак, экспертызаў, судоў, галадовак і арыштаў. Потым яшчэ паўтара года ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

А як дзівіліся высокія чыноўнікі, да якіх мне ўдавалася данесці перыпетыі нашай справы. Я меў сустрэчы з міністрам па падатках і зборах (МПЗ) Ганнай Дзейка і старшынёй Вышэйшага гаспадарчага суда (ВГС) Віктарам Камянковым. Здавалася, я быў зразуметы, яны рабілі пазнакі ў нататніках, перапытвалі, калі гаворка ішла пра ўжо вельмі відавочныя парушэнні з боку іх падначаленых. Дзейка нават абяцала разабрацца на працягу трох дзён. Але адказы на пытанні падмяняліся казуістыкай.

### Першы «наезд»

А пачалося ўсё з дамовы пра платнае аказанне паслуг па кіраванні транспартнымі сродкамі. Яе ўклалі прадпрыемства «Ніка-Транс» і прадпрымальнік Аўтуховіч 30 красавіка 2003 г. Дамова прадугледжвала ўзаемную выгаду: прадпрыемства атрымлівала стабільны прыбытак ад штомесячных плацяжоў за паслугі, а прадпрымальнік пазбываўся лішняй бухгалтэрыі, звязанай з утрыманнем сарака наёмных працаўнікоў.

Не буду хаваць, да такога рашэння падштурхнуў дэкрэт кіраўніка дзяржавы, які прадпісваў прадпрымальнікам скараціць колькасць наёмных працаўнікоў да трох чалавек. Копію дамовы аддалі ў падатковую інспекцыю — вывучайце.

І тут пачалося: адна праверка, другая — ніякіх парушэнняў. 28 жніўня ў Ваўкавыск прыбыла сталічная брыгада падаткавікоў на чале з начальнікам аддзела МПЗ А.Т. Галаваровым. Яны мелі прадпісанне ад намесніка міністра В.Б.Каменка на праверку «Ніка-Транс» на прадмет датрымання парадку прыёму наяўных грошай. Але ж кіраванае мною прадпрыемства займалася міжнароднымі грузаперавозкамі, замоўцамі ў нас былі еўрапейскія і расійскія фірмы, усе разлікі ішлі па безнаяўным разліку. Галавароў пяснiў: яны правялі рэйдавую праверку дзейнасці таксі ў горадзе і выявілі маіх кіроўцаў за рулём аўтамабіляў Аўтуховіча, а «права прымаць наяўныя грашовыя сродкі кіроўцамі «Ніка-Транс» дамовай не прадугледжана».

Галавароў вельмі спяшаўся. Ужо на наступны дзень пасля пачатку праверкі ён склаў прамежкавы акт. І ў канцы дакумента пазначаліся цалкам рэальныя эканамічныя санкцыі. Спяшаўся так, што мы пасля налічылі не менш за дзесяць парушэнняў міністэрскага Палажэння пра парадак правядзення праверак. Прычыны паспешлівасці скора патлумачыліся. 4 верасня намеснік міністра Каменка накіроўвае ў Мінтранс хадайніцтва пра пазбаўленне ліцэнзіі прадпрымальніка Аўтуховіча за «шматлікія парушэнні падатковага заканадаўства».

І тут адбыўся канфуз: высвятляецца, што ўсе праверкі ў Аўтуховіча дагэтуль сканчаліся нязменным «парушэнняў не выяўлена». Распараджэнне пра прыпыненне ліцэнзіі адмяняе пракуратура.

### Суд Гарноўскага

А ў прадпрымальніка ўжо поўным ходам ідзе новая праверка. Працуюць прадстаўнікі абласной падатковай інспекцыі. Яны не спяшаюцца, на складанне прамежкавага акта патрацілі тыдзень. Выснова — «парушэнне парадку разлікаў паміж суб'ектамі гаспадарання» і эканамічныя санкцыі! І, нягледзячы на рэзалюцыю Нацбанка аб тым, што «парушэнняў заканадаўства ў частцы правядзення разлікаў не ўгледжваецца», узбуджаюцца дзве судовыя справы — у ВГС і ў Гродзенскім абласным гаспадарчым судзе.

Суддзя ВГС Гарноўскі А.А. за тры пасяджэнні разглядае справу і выносіць рашэнне на карысць падатковых органаў. Я не раз назіраў за рэакцыяй спецыялістаў у галіне права, якія чытаюць гэту паперу. Яны раз-пораз з недаверам пазіралі на тытульны ліст з дзяржаўным гербам і назвай суда.

Сутнасць рашэння можна выказаць так: спачатку суд канстатаваў нікчэмнасць дамовы між «Ніка-Транс» і прадпрымальнікам Аўтуховічам, а затым пацвердзіў парушэнне парадку разлікаў, грунтуючыся на палажэннях тае «нікчэмнае» дамовы. І гэта рашэнне ляжыць сёння ў падмурку хісткай сцяны хлусні, узведзенай вакол імя Аўтуховіча.

### Канфуз

Падчас пасяджэння касацыйнай інстанцыі Гродзенскага аблсуда, якая разглядала скаргу Аўтуховіча, суддзя спытаў у прадстаўнікоў падатковай: а што за разлікі вы маеце на ўвазе, паказваючы на парушэнне іх парадку? А тым і сказаць няма чаго... І адмянілі іх рашэнне. Тады справу перадалі ў Вышэйшы гаспадарчы суд, і намеснік старшыні ВГС Ягораў А.П. апратэставаў пастанову касацыйнай інстанцыі, і прысуд застаўся ў сіле.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Але тут выявіўся новы канфуз. Вывучаючы рашэнні ВГС адносна прадпрыемства і прадпрымальніка, мы адкрылі, што ў гэтых двух рашэннях працілегла ацэньваецца функцыя перавозчыка ў дамове перавозкі пасажыраў. Адно прызнае перавозчыкам «Ніка-Транс», а іншае — Аўтуховіча. І абодва падтрымліваюць выснову падатковай службы пра парушэнне парадку разлікаў. Супярэчнасць вырашыў Прэзідыум ВГС, адмяніўшы ўсе судовыя рашэнні адносна Аўтуховіча і перадаўшы справы па Аўтуховічу зноў у суд першай інстанцыі.

### Вінаваты «ў выпадку літаральнага тлумачэння»

У снежні 2004 г. на прадпрыемства прыехала чарговая праверка пад кіраўніцтвам інспектара МПЗ Лукашэвіча Г.Г. і зрабіла выснову ўжо не пра парушэнне парадку разлікаў, а пра ўхіленне ад выплаты падаткаў. У лютым узбуджаецца крымінальная справа, падазраваным прызнаюся я, дырэктар «Ніка-Транс». Падаткавікі блакуюць рахункі, пачынаецца вопіс маёмасці. Прадпрыемства спыняецца.

І раптам удача: следчы Упраўлення дэпартамента фінрасследаванняў КДК Оліхвер Н.І., страціўшы надзею разабрацца ў праблемах, навернутых падаткавікамі па нашых справах, прызначае міжведамасную экспертызу. Пакуль экспертная камісія раскачвалася, з'явілася хоць нейкая магчымасць працаваць.

У верасні 2005 г. пяць з шасці экспертаў (за выключэннем прадстаўніка МПЗ) не прызналі ў дзеяннях «Ніка-Транс» і Аўтуховіча парушэнняў эканамічнага заканадаўства. Аднак эксперт з Мінэканомікі салідарызаваўся з МПЗ і зрабіў у заключэнні запіс аб тым, што «ў выпадку літаральнага тлумачэння пункта 6 Дэкрэта... (Аўтуховічам — заўв. аўт.) былі парушаныя патрабаванні пункта 6 Дэкрэта Прэзідэнта РБ ад 27 студзеня 2003 г. №4». Гэта і паслужыла фармальнай нагодай для арышту Аўтуховіча ў кастрычніку 2005 г. Логіка простая — навошта Аўтуховіч парушыў патрабаванні Дэкрэта? Правільна: каб не плаціць падаткі. Вось і атрымай абвінавачванне ва ўхіленні ад выплаты падаткаў.

### З каго браць падаткі?

Канфуз разрастаўся проста на вачах, бо яшчэ ў студзені было прынятае рашэнне спагнаць тыя, нібы няплачаныя, падаткі з «Ніка-Транс». А тут Дзяржкантроль вырашыў гэтыя ж падаткі патрабаваць з Аўтуховіча, абапіраючыся на заключэнне экспертнай камісіі, якая прызнала перавозчыкам у дадзенай сітуацыі прадпрымальніка. Не ведаю, як яны між сабой дамаўляліся, але 1 снежня 2005 г. МПЗ адмяняе рашэнне, бо «ў акце ад 22.12.2004 г. (вынікі праверкі Лукашэвіча — Рэд.) не цалкам высветленыя ўсе істотныя факты і акалічнасці»...

### Суду «і так усё зразумела»

У лютым 2006 г. у Кастрычніцкім судзе Гродна пачаўся суд. На лаве падсудных два чалавекі — Аўтуховіч па абвінавачванні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў і я па абвінавачванні ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі з карыслівых памкненняў. Суддзя Рачынскі Н.П. добрасумленна слухаў сведак абвінавачвання — без малога паўсотні душ. І ніводны не пацвярджаў прад'яўленыя абвінавачванні. А калі спіс сведак пачаў падыходзіць да канца, дзяржабвінаваўца Шчарбак Е.М. запатрабаваў прызначыць эканамічную экспертызу і даручыць яе Гродзенскаму КДК. Суддзя пагадзіўся, хоць неабходнасці ў ёй зусім не было.

І вось, пасля выступу эксперта, якая нудна пералічвала доўгія калонкі сумаў, дзяржабвінаваўца заявіла, што ўладай яму дадзенай, ён выстаўляе новае абвінавачванне. Аўтуховічу — у ажыццяўленні незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці, а мне — у злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі, але ўжо не з карыслівых памкненняў, а «жадаючы аказаць дапамогу ...(Аўтуховічу — Рэд.) і атрымаць ад Аўтуховіча М.М. узаемную паслугу ў выглядзе сістэматычнага паступлення на разліковы рахунак прадпрыемства ў якасці яго прыбытку вызначаных сум грашовых сродкаў...».

Адвакаты ў шоку — новае абвінавачванне, увесь працэс па новай? А суддзя спакойна заяўляе: «Навошта? Мне і так усё зразумела!» І прызначае спрэчкі бакоў, затым апошняе слова і прысуд.

### Усё пайшло з малатка

Канец працэсу адзначыўся масавымі візітамі судовых выканаўцаў і падатковых інспектараў. Першыя кіраваліся рашэннем Кастрычніцкага суда Гродна, другія — рашэннямі ВГС. Відавочцы сцвярджаюць, што дзейнічалі па прынцыпе: хто што знайшоў, тое і ўрваў. У вопісах часцяком фігуравала адна і тая ж маёмасць.

На сёння ўся маёмасць «Ніка-Транс» і прадпрымальніка Аўтуховіча прададзеная судовымі выканаўцамі з аўкцыёну, адабралі нават мой асабісты гараж. Паводле судовых пастаноў, Аўтуховіч і Лявонаў вінаватыя дзяржаве каля мільёна даляраў па курсе на сярэдзіну 2006-га.

### Супярэчнасць засталася

А канфуз застаўся. На сённяшні дзень дзейнічаюць два судовыя рашэнні — Гарноўскага і Рачынскага, што адны і тыя ж акалічнасці ацэньваюць працілегла. 31 сакавіка 2008 г. я і Аўтуховіч накіравалі зварот на імя Генпракурора з указаннем на супярэчнасці ў судовых рашэннях. Прынамсі, адно з іх павінна быць адменена па выключна юрыдычных падставах. У адказ прыйшла адпіска, маўляў, Гарноўскі быццам бы і не кажа, што менавіта прадпрыемства з'яўляецца перавозчыкам, а Рачынскі гэта пытанне нібыта наогул не разглядаў, і для высноў суда гэта акалічнасць быццам бы значэння не мае. Але сама пракуратура так і не сказала, хто выступіў у дадзенай сітуацыі перавозчыкам пасажыраў. І я іх разумею — небяспечна!

# Лукашэнка носіць гадзіннік за 16 тысяч даляраў

**Фатографы атрымалі рэдкую магчымасць здымаць кіраўніка Беларусі свабодна — у часе яго візіту ў Літву.**

Унутры краіны здымаць Лукашэнку дазваляюць толькі групе абраных фатографаў, прычым з пэўных ракурсаў. Напрыклад, здымаць Лукашэнку ў профіль забаронена.

На віленскіх здымках журналіст Віктар Малішэўскі разгледзеў цікавую дэталь — швейцарскі гадзіннік Patek Philippe Calatrava 5120j на руцэ Лукашэнкі. Такія каштуюць 11 тысяч еўра, або 16 тысяч даляраў.

Інфармацыя пра заробак Лукашэнкі закрытая. Яе публікуюць толькі за гады, што папярэднічаюць прэзідэнцкім выбарам. У 2005 г. ён складаў каля 2300 даляраў у месяц. Хоць Лукашэнка не раз публічна называў сябе «жабраком», ён ацэньвае свой «дакладны час» у сем месячных заробкаў.

Такой жа маркі, як у кіраўніка Беларусі, гадзіннік і ў кіраўніка расійскага ўрада – Уладзіміра Пуціна. Ён карыстаецца гадзіннікам Patek Philippe Perpetual Calendar з белага золата, коштам 40 тысяч еўра. Гэта прыкладна гадавы легальны заробак расійскага прэм'ера.

Не адстаюць ад прадстаўнікоў афіцыйнага Крамля і апаненты. Лідэр КПРФ Генадзь Зюганаў носіць гадзіннік Longines. Кошты на гадзіннікі гэтай швейцарскай маркі пачынаюцца ад 7 тысяч еўра.

Раман Абрамовіч, прыбыткі якога значна пераўзыходзяць афіцыйныя заробкі ўсіх расійскіх кіраўнікоў, карыстаецца гадзіннікам Rolex Daytona за 20 тысяч еўра. Шмат для каго такі гадзіннік — мара. Толькі не для Маскоўскага патрыярха Кірылы з яго Breguet за 30 тысяч еўра. Кіраўнік РПЦ упадабаў мадэль з корпусам белага золата і раменьчыкам са скуры кракадзіла.

Самы дарагі з «рассакрэчаных» гадзіннікаў вядомых палітыкаў належыць кіраўніку італьянскага ўрада Сільвіё Берлусконі. Аматар дарагіх аўтамабіляў, добрага футбола і прыгожых жанчын можа пахваліцца Vacheron Constantin за 414 тысяч еўра. А гэта насамрэч шмат. Нават для Абрамовіча.

Гэта не першы выпадак, калі Лукашэнка дэманструе на публіцы нятанныя рэчы. У жніўні мінулага года ў адным з калгасаў на Міншчыне на кіраўніку Беларусі бачылі рэмень маркі «Hermes» коштам ад 600 даляраў.

Палітычная культура еўрапейскай поўначы і ЗША зусім іншая. Былы прэзідэнт ЗША Джордж Буш-малодшы носіць гадзіннік старой амерыканскай фірмы Timex за 50 даляраў. А гадзіннік Барака Абамы маркі Jorg Grey6500 Chronograph каштуе $325. Паспрачацца ў сціпласці з імі можа прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі. Яго гадзіннік IWC Schaffhausen, хоць і надзейнай швейцарскай маркі, каштуе ад 250 еўра. Чым больш празрыстая палітычная сістэма, тым складаней «наашчаджаць» грошай на звышпрэстыжныя цацкі. Інакш неасцярожны рух рукавом можа дазволіць спрытнаму фатографу сфатаграфаваць дарагі гадзіннік. Які спачатку стане прычынай скандалу, а потым і адстаўкі з займанай пасады.

**Сямён Печанко, Алесь Пілецкі**

### Самыя дарагія гадзіннікі

У Мінску самыя дарагія гадзіннікі швейцарскіх марак Vacheron Constantin і IWS (International Watch Co Schaffhausen) прадаюцца ў краме De Luxe, што на праспекце Незалежнасці (Скарыны), 58. Іх кошты дасягаюць сотні мільёнаў рублёў.

**Vasheron Constantin**

75—110 млн. руб.

У байнэце на аўкцыёнах выстаўляюць падробкі пад гэтую марку за 50—55 даляраў.

**IWS**

37—98 млн руб.




### Гадзіннікі апазіцыі

**Лявон Баршчэўскі**

кітайскі, набыты за 20 злотых (7 долараў) у Варшаве.

**Анатоль Лябедзька**

швейцарскі Swatch, каля 300 даляраў.

**Аляксандр Мілінкевіч**

амерыканскі Timex, коштам 110 даляраў.

**Алесь Міхалевіч**

швейцарскі гадзіннік Certina, 400 даляраў.

**Віталь Рымашэўскі**

мае швейцарскі Swiss Military. Але цаны не ведае — яму падарылі.

Эканомным выявіўся **Мікола Статкевіч**. Ён свой кварцавы набыў на варшаўскім вакзале за 5 даляраў!

### «Хацелася б даведвацца пра фінансавае становішча кіраўніка краіны часцей, чым раз у пяць гадоў»

«Як кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, безумоўна, павінен адпавядаць свайму статусу, падкрэсліваючы яго адпаведнымі атрыбутамі. Як, напрыклад, той жа гадзіннік ці рэмень за $600, — кажа Малішэўскі. — Але адна рэч, калі ён дэманструе дарагія аксесуары ў часе замежных візітаў, ці прымаючы высокіх гасцей. Іншая рэч, што прэзідэнт не павінен эхаць з такім рэменем ці гадзіннікам у калгас».

«Пісаць ці не пісаць пра такія рэчы? Безумоўна, трэба пісаць. Увогуле, хацелася б даведвацца пра фінансавае становішча кіраўніка краіны часцей, чым раз у пяць гадоў пад выбары», — упэўнены В. Малішэўскі.

**СП**

### Яшчэ адзін гадзіннік прэзідэнта?

Магчыма, у прэзідэнта не адзін Patek Philippe Calatrava 5120j, пра які ўсе пісалі на мінулым тыдні. Фатограф агенцтва РІА Новости злавіў Лукашэнку таксама з гадзіннікам Patek Philippe на правай руцэ. Але гэта, здаецца, іншы гадзіннік.

На «віленскім» Patek Philippe Calatrava няма асобнага секунднага цыферблата ўнізе. На гадзінніку, знятым расійскім фотарэпарцёрам, выглядае, што ёсць. Так што гэта, хутчэй за ўсё, Patek Philippe Calatrava Ref. 5119j. Фота зроблена 4 лютага 2009 года. І каштуе такі гадзіннік нават крыху танней — усяго 14 268 долараў.

АПЫТАННЕ «НН»

## Мінчане пра гадзіннік Лукашэнкі: «Гэта крывадушнасць у пэўнай ступені»

**Швейцарскі гадзіннік кіраўніка дзяржавы за 11 тысяч еўра — гэта нармальна ці не? Пра гэта мы спыталі ў мінчан і гасцей беларускай сталіцы.**

**Людміла і Аляксей, пенсіянеры з Расіі:**

Вы ведаеце, у расійскага прэзідэнта даражэйшыя. А што, Лукашэнка горшы за расійскага прэзідэнта?

**Кастусь, музыка:**

Гэта занадта — з раскошы шалеюць.

**Марына і Алесь, студэнты:**

**Марына:** Мне, калі шчыра, дык абыякава.

**Алесь:** У прынцыпе, для прэзідэнта 11 тысяч еўра — не такая вялікая сума. Усё залежыць ад таго, як ён іх атрымаў.

**Марына:** Мяркуючы па тым, якія ў нас ездзяць машыны па горадзе, у многіх жыхароў Мінска і гадзіннікі даражэйшыя.

**Андрэй і Зміцер, навучэнцы:**

**Андрэй:** У кожнага прэзідэнта павінен быць прадстаўнічы выгляд, бо ён прадстаўляе сваю краіну. Калі б у яго быў гадзіннік танны, то ён ставіў бы пад сумнеў прэзентабельнасць усёй краіны. Я лічу, што шмоткі, гадзіннік, якія на ім, павінны быць добрымі.

**Зміцер:** Тут мусіць быць баланс. На Захадзе набываюць гадзіннік, які каштуе роўна столькі, колькі зарабляеш у месяц. Каб у нас хаця б у сярэднага класа быў заробак 5—7 тысяч даляраў...

**Андрэй:** А тое, што гадзіннік швейцарскі — гэта не вельмі добра. Калі б у яго быў гадзіннік беларускага завода — было б правільна.

**Зміцер:** Гэта крывадушнасць у нейкай ступені. З аднаго боку — купляйце беларускае, а з іншага боку — гадзіннік швейцарскі. У «Саўс-Парку» была нават такая серыя: што яны могуць казаць, што не вядуць вайну, хаця насамрэч вядуць вайну. Вось і тут таксама.

**Апытала Вольга Жарнасек 23 верасня каля парка Горкага ў сталіцы**

# Нашто (дарагі)

**«Гэта як якасная вопратка», — кажа шараговы аматар**

**«Наша Ніва»: Андрэй, як вам Лукашэнкаў гадзіннік?**

**Андрэй Мачульскі:** Фірма Patek Philippe адна з найлепшых у сваім класе. Адзіная фірма, якая мае швейцарскі сертыфікат найвышэйшай якасці на ўсе свае мадэлі. Ніводная іншая фірма не мае такога сертыфіката адначасова на ўсю прадукцыю. Гадзіннікі робяць уручную спрактыкаваныя майстры. Але Лукашэнкаў гадзіннік не найлепшы ў гэтай фірме, і я б сказаў, што нават адносна недарагі, базавая элегантная мадэль, не хранограф, які каштаваў бы істотна даражэй. У Пуціна і Біла Гейтса, якія носяць марку Patek Philippe, гадзіннікі значна даражэйшыя: маюць вялікую колькасць разнастайных мудрагельстваў кшталту вечных календароў, індыкатараў фазаў Месяца ці турбіёнаў — прыстасоўчыкаў, якія дазваляюць рэгуляваць правільны ход гадзінніка ў залежнасці ад палажэння ў прасторы.

**«НН»: Ці проста спецыялісту адрозніць фальшыўку ад сапраўднага гадзінніка?**

**АМ:** Часам вельмі проста: дастаткова зірнуць на лічбакола, і бачыш: на закрытым маленькім хранометрам лічбаколе фальшывага гадзінніка ўсё ж уляпілі збытную тут лічбачку ці не зрабілі на абводзе гравіраваную рысачку. Часам можа адрозніць толькі гадзіншчык. Галоўная хіба ў фальшывых гадзінніках — неадпаведнасць механізма і выгляду. Памер механізма дыктуе выгляд, а не наадварот, але кітайцы робяць любыя корпусы з любымі канфігурацыямі і памерамі механізмаў...

**«НН»: Дзе ў Беларусі можна купіць дарагія брэнды?**

**АМ:** Можна купіць праз сеціва: ёсць адмысловыя людзі, якія займаюцца дарагімі брэндамі. Але калі я куплю гадзіннік за 15 тысячаў да-




Лукашэнка даляцеў да мяжы верталётам, а ў Каменным Логу перасеў на бранявaны «Мэрсэдэс».




Асноўным пасланнем да Еўропы было: Не душыце на мяне. Змірыцеся з тым, што ў Беларусі дыктатура.




У Беларусі да Лукашэнкі нікога не падпускаюць, а ў Вільні ўсе сядзелі, як хто хацеў.




«Вызваліце палітвязняў у Беларусі» — з такімі плакатамі Лукашэнку сустракалі літоўскія Маладыя кансерватары. Студэнты і выкладчыкі ЕГУ пратэставаць не выйшлі.

# чалавеку гадзіннік?

гадзіннікавых брэндаў, дызайнер **Андрэй Мачульскі**.

ляраў, дык мне прасцей з'ездзіць у Еўропу і купіць яго на месцы.

**«НН»: Андрэй, ну нашто за цяперашнім светам насіць той гадзіннік, і ў дадатак дарагі? Ні галавы, ні сэрца… Ёсць жа мабільнік з уштукаваным гадзіннікам.**

**«НН»:** Гадоў дзесяць таму са з'яўленнем мабільніка ўсе ўрачыста знялі гадзіннікі, аднак цяпер вяртаюцца да іх. Гадзіннік цяпер купляюць як упрыгажэнне, частку гардэроба. Памятаю, калі я яшчэ студэнтам толькі «падсядаў» на гадзіннікавыя брэнды, дык купіў сабе арыгінальны, але зусім недарагі Diesel. Нешта ён пачаў пазніцца на пару секунд, і я пазваніў прадаўцу. «Вы першы, хто пазваніў, зазвычай цяпер такіх дробязяў не заўважаюць», — адказаў мне ён.

Адчуўшы кан'юнктуру, цяпер свае гадзіннікавыя лініі робяць фірмы, якія калісь лічыліся выключна вопраткавымі: Adidas, Calvin Klein.

Другі момант: цяпер людзі лічаць за лепшае купіць хай сабе недарагі, але арыгінальны брэнд. Інтэрнэт віруе ад прапановаў купіць-прадаць якасны гадзіннік сэканд- і фёрст-хэнд. Скажам, Swatch за 400 даляраў. Гэта як якасная вопратка: ты плаціш трохі больш, але адчуваеш, што носіш original, сапраўднае і, адпаведна, самаадчуванне паляпшаецца.

**«НН»: Дык значыць, 400 даляраў і вы шчаслівы чалавек?**

**АМ:** Па вялікім рахунку, гадзіннікаў павінна быць прынамсі 3: адзін, каб бавіцца спортам: водаўстойлівы і нябіткі, другі элегант-мадэль — пад гарнітур, і трэці штодзённы. Класічны не заўсёды пасуе пад casual, штодзённую вопратку.

**Гутарыў Павал Касцюкевіч**

## «Цэны на элітныя гадзіннікі пачынаюцца ад 300 тысяч рублёў»

### Якія самыя прадстаўнічыя мужчынскія гадзіннікі можа прапанаваць беларускі завод гадзіннікаў «Прамень»?

— Цэны на элітныя гадзіннікі пачынаюцца ад 300 тысяч рублёў. Яны даражэйшыя за іншыя праз вальфрамавыя ўстаўкі. Самы дарагі – недзе 550 тысяч, — тлумачаць у фірмовай краме «Промня».

— А можна зрабіць гадзіннікі з брыльянтамі ці з залатымі ўстаўкамі па спецзамове?

— Мы не выпускаем такі тавар.

Калі кіраўніцтва дзяржавы вырашыць трымацца прынцыпу «купляйце беларускае», то і такія аксэсуары, як гадзіннік на руцэ Лукашэнкі, мусяць быць айчыннай вытворчасці. Несумненна, што тады, натхніўшыся прыгажосцю беларускіх гадзіннікаў, уся Еўропа ўстане ў чаргу за Luch-амі. Пакуль жа на складах завода назапасіўся двухгадовы запас прадукцыі.

**Ягор Марціновіч**

Паводле каталогу «Промня», які пазіцыянуе сябе за мяжой пад брэндам Luch, найдаражэйшы мужчынскі гадзіннік каштуе 546 880 рублёў. Ён водаўстойлівы, мае 24–гадзінную шкалу і каляндар.



## Каму прададуць «Прамень»?

Завод гадзіннікаў «Прамень» апынуўся ў цэнтры скандалу. Паводле звестак інтэрнэт-газеты «Ежедневник», цікавасць да «Промня» выказалі дзве швейцарскія кампаніі — Swatch і Franck Muller. Улада схілялася да супрацоўніцтва то да аднаго, то да другога боку. Урэшце, урад выбраў прапанову Franck Muller. 80% акцый завода, участак пад Мінскам у 30 га і правa працаваць без ПДВ — усё гэта аддаецца за $13 мільёнаў. Між тым, паводле ацэнкі «Ежедневника», нават пустыя памяшканні завода каштуюць $100 мільёнаў.

Між тым, частку плошчы завода прадалі іншым кампаніям. Пад сцягам нацыяналізацыі большасць тэрыторый была вернутая дзяржаве. Але некаторым — напрыклад, МТС і «Белзнешэканомбанку» — удалося адстаяць свае офісы. Цяпер гарачыя галовы з Адміністрацыі прэзідэнта прапануюць адабраць і іх, а на «Прамень» абрынуліся праверкі Дзяржкантролю.

Працэдура банкруцтва ААТ «Мінскі гадзіннікавы завод» пачалася ў ліпені 2006 г. Тады запазычанасць прадпрыемства перавысіла 8 млрд рублёў. У студзені 2009 г. завод нацыяналізавалі. Дзяржава атрымала 99,9% акцый прадпрыемства, а даўгі ў $12,7 мільёнаў спісалі.

**ЯМ**

Спадарожніца кіраўніка дзяржавы можа выбраць сабе гадзіннік серыі VIP за 446 490 рублёў.



А вось для дзяцей выбар гадзіннікаў невялікі. Застаецца спадзявацца, што сыну кіраўніка дзяржавы спадабаюцца гадзіннікі за 35 470 рублёў з пакемонамі ці дыназаўрыкамі.

# У Мінск вяртаецца гістарычная тапаграфія

Аказваецца, з дзясятак мінскіх сквераў дагэтуль былі безназоўнымі. Хоць некаторыя з іх маюць стогадовую гісторыю. Толькі на тым тыдні Мінгарсавет прыняў рашэнне аб называнні безыменных сквераў і вуліц.

Сквер між Чырвонаармейскай—Маркса—Энгельса—праспектам Незалежнасці цяпер называецца Аляксандраўскі. Ён адзін з найстарэйшых у горадзе і меў такі назоў у дасавецкія часы, ад пабудаванай там у 1870 г. капліцы Аляксандра Неўскага. А ў савецкія часы сквер меў рэпутацыю плацдарма нефармалаў і найменне Панікоўка. Бо фантан у выглядзе хлопчыка з лебедзем нагадваў жартаўнікам Панікоўскага з гуссю з рамана Ільфа і Пятрова.

Дзеці тых жартаўнікоў цяпер кажуць, што Аляксандраўскім сквер названы ў гонар аднаго вядомага Аляксандра, што побач працуе.

З'явіліся скверы Бондараўскі, Татарскі, Грушаўскі, Тучынскі, Ляхаўскі, назвы якіх угрунтаваныя на гісторыі Мінска, а таксама сквер Адама Міцкевіча — дзе стаіць помнік паэту.

Перайменаваныя і двое могілак, савецкія назовы якіх не паддаваліся асэнсаванню. «Піянерскія» (Цэнтральны раён) сталі «Крупцамі», бо ў XVI ст. былі заснаваныя як могілкі вёскі Крупцы. Могілкі «Дружба» (Маскоўскі раён) перайменаваныя ў «Брылеўскія», бо месцяцца побач з мікрараёнам Брылевічы.

**СМ, паводле БелаПАН**



**Нязвыклага хараства крыж паставілі ў вёсцы Салацце Гродзенскага раёна гродзенскі каваль Юры Мацко і прадпрымальнік Юры Рэмша. Яны абодва маюць у гэтай вёсцы дамы.**
**Крыж асвяцілі рыма-каталіцкі, грэка-каталіцкі і праваслаўны святары супольна. Імшу адслужыў ксёндз па-польску. Па-беларуску вяскоўцаў віншаваў уніяцкі святар. А праваслаўны прамаўляў па-расійску. Усім ім цёпла пляскалі ў далоні.**

**Радыё «Свабода»**

# Краўцэвіч: «Ідзе спроба ліквідацыі Каліноўскага як героя»

25 верасня ў Мінску Беларускае гістарычнае таварыства зладзіла навуковую канферэнцыю «Кастусь Каліноўскі і яго эпоха ў дакументах і культурнай традыцыі». Адзін з арганізатараў, гісторык Аляксандр Краўцэвіч, патлумачыў неабходнасць такой канферэнцыі тым, што «асоба Каліноўскага сёння выклікае неадназначную рэакцыю ў дзяржаўных ідэолагаў. Ідзе спроба ліквідацыі Кастуся Каліноўскага як нацыянальнага героя».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

У якасці прыкладу гісторык прывёў падручнік па гісторыі Беларусі для 10-га класа. Некаторыя яго параграфы і раздзелы адкрыта скіраваны на фальсіфікацыю айчыннай гісторыі. Напрыклад, параграф 26, які называецца «Польскае паўстанне 1863 г. на беларускіх землях» і раздзел чацвёрты дадзенага параграфа пад назвай «Гістарыяграфічны міф аб Вікенцію Каліноўскім».

Той жа падручнік называе Міхаіла Мураўёва-Вешальніка таленавітым адміністратарам.

**Алесь Пілецкі**

# Свае і чужыя

### Рэдактара «Літаратуры і мастацтва» знялі за тое, што выданне аглядала пісьменнікаў, якія не ўваходзяць у лукашэнкаўскі саюз.

Пасаду галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва» страціў Анатоль Казлоў. Цяпер ягоныя абавязкі выконвае Мікола Станкевіч.

Рэдактарская чахарда ў «ЛіМе» не спыняецца ад 2002—2003 гадоў. Тады ад стырна адсунулі старыя кадры і стварылі выдавецкі холдынг «ЛіМ».

«Галоўнымі прэтэнзіямі да Анатоля Казлова было тое, што ён даваў агляды творчасці пісьменнікаў, якія не ўваходзяць у дзяржаўны СПБ», — сцвярджае блогер iuzhyk. Гэта аўтар «ЛіМа», пісьменнік Міхась Южык. Заўсёднік холдынгу, ён добра арыентуецца ў перыпетыях падзей.

Паводле ягоных словаў, за звальненнем стаяць «высокапастаўленыя кіраўнікі афіцыёзнага Саюза пісьменнікаў Беларусі (СПБ)». Найперш — Анатоль Аўруцін, «які не можа перажыць, што «ЛіМ» не прызнаваў яго геніяльнасць».

Аўруцін, заўважым, надта блізкі да Мікалая Чаргінца, боса СПБ.

**Мікола Бугай**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Небяспечныя сувязі: Анатоль Казлоў (злева) з лідэрамі незалежнага Саюза Алесем Пашкевічам (у цэнтры) і Барысам Пятровічам.**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### Усе прыгоды хобіта Фрода

Выйшла трэцяя кніга сагі «Уладар Пярсцёнкаў» у беларускім перакладзе.

Можна паглядзець аднайменны фільм, агораць англійскі арыгінал ці спакусіцца расійскім перакладам, але, шчыра: што можа быць лепей за вечар з томам пра прыгоды хобіта Фрода і яго сяброў у беларускім перакладзе?

Выйшла трэцяя кніга сагі Джона Рональда Руэла Толкіна «Уладар Пярсцёнкаў» — «Вяртанне караля». Нарэшце маем поўны набор: пасля папярэдніх тамоў — «Звяз пярсцёнка» (2008) і «Дзве вежы» (2009).

Можна любіць паралельныя светы Толкіна з апісаннямі бітваў паміж гномамі і оркамі ды сцэнамі кахання з удзелам эльфіцы і чалавека ці, наогул, абыякава мінаць яго творы ў кнігарнях, але нельга не адцеміць поўны пераклад «Уладара Пярсцёнкаў» — першае з абвешчаных яшчэ на світанку адраджэння запаўненне шматлікіх кніжных прабелаў у масавай літаратуры.

Пакуль, згодна з планамі замяшчэння чужога сваім, «Гары Потэр» і кампанія нецярпліва чакаюць у чарзе, гартайма апошняга «Уладара» з пачуццём падзякі перакладчыкам Дзмітрыю Магілеўцаву і Крысціне Курчанковай за іх, яўна не аднагадовую, руплівую працу.

**Лявон К**




**Толкін Джон Рональд Руэл. Уладар Пярсцёнкаў: Вяртанне караля** / Пер. Д.Магілеўцава і К.Курчанковай. — Мінск, 2009. — 306 с.

### Кніга пра беларускія гаворкі Латвіі

Манаграфія «Gwary bialoruskie na Lotwie w rejonie kraslawskim» («Беларускія гаворкі ў Краслаўскім раёне Латвіі») выйшла ў Польшчы. Гэта першае даследаванне польскага мовазнаўцы Міраслава Янкавяка ў запланаванай серыі кніжак пра беларускую мову за межамі Беларусі (Смаленшчына, Чарнігаўшчына, Віленшчына і Беласточчына). Гэта першая ў гісторыі надрукаваная манаграфія пра беларускую мову ў Латвіі.

Кніга добра ілюстравана аўтарскімі фотаздымкамі, мапамі і тэкставымі прыкладамі гаворак. Кнігу можна замовіць праз інтэрнэт. Кантактны e-mail: mirek.jankowiak@interia.pl

**Пчолка**

## СЦІСЛА

### «Свабодны тэатр» у ЗША

«Свабодны тэатр» Мікалая Халезіна прадставіў у Вашынгтоне дзве пастаноўкі — «Пакаленне Jeans» і «Спасцігаючы каханне». «Спасцігаючы каханне» — гісторыя кахання, якую распавядае жанчына, чый муж быў выкрадзены і забіты. Прататып галоўнай гераіні — Ірына Красоўская. Спектакль быў паказаны 16 верасня, у дзень, калі споўнілася 10 гадоў з моманту знікнення Анатоля Красоўскага.

### Беларускія фільмы ў Берліне

Два фільмы вытворчасці «Белсата» возьмуць удзел у берлінскім фестывалі Prix Europa. Гэта стужка «Свята на нашай вуліцы» рэжысёра Адама Галіна і фільм «Рабінзоны Мантсінсаары», які «Белсат» зняў у супрацы з партнёрамі з Нямеччыны, Фінляндыі ды Францыі.

### Кніга Бабкова ў паўфінале прэміі Angelus

Раман беларускага пісьменніка Ігара Бабкова «Адам Клакоцкі і ягоныя цені» ў перакладзе на польскую мову трапіў у паўфінал літаратурнай прэміі Angelus. Усяго на перамогу прэтэндуюць 14 кніжак. Сярод супернікаў Бабкова — польскі пісьменнік Ежы Пільх, чэх Ёзэф Шкворэцкі, а таксама Бернард Шлінк з Нямеччыны. Пераможца атрымае 150 тысяч злотых (прыкладна $53,5 тысячы). Фінальная сямёрка будзе вядомая 20 кастрычніка, а ўручэнне прэміі адбудзецца 5 снежня.

### Культурнай сталіцай Еўропы стане Рыга

Латвійская Рыга і шведскі горад Умеа стануць культурнымі сталіцамі Еўропы ў 2014 г. Сёлета такі статус мае Вільня, «крывіцкая Мекка».

### Кустурыцу ўзнагародзіць патрыярх

Сербскага рэжысёра Эміра Кустурыцу ўзнагародзяць прэміяй Міжнароднага фонду адзінства праваслаўных народаў за распаўсюд хрысціянскіх каштоўнасцей. Узначаліць цырымонію патрыярх Маскоўскі.

**КМ; belsat.eu; Еўрарадыё**

# Музыка для паслямузычнага пакалення

Засталіся імгненні да прыбыцця лідэраў сусветнай танцавальнай музыкі, гурту Prodigy, у Мінск. Піша **Павал Касцюкевіч**.



**Prodigy**
заснаваў класічны піяніст Ліям Хаўлет у 1990 у Англіі. Іншыя члены гурту, Кейт Флінт і Максім Рыяліці, музыку не складалі: толькі тое рабілі, што танчылі (яны так проста і пісалі на дысках сваё амплуа — «танцор») і пераконвалі маладога Ліяма Хаўлета, што ён геній, і што яго музыка вартая аўдыёзапісаў.
Пасля фенаменальнага музычнага і фінансавага поспеху альбома Music for the Jilted Generation (1994) (продаж 17 млн асобнікаў — рэкорд у гісторыі танцавальнай музыкі) хлопцы сцемілі, што яны больш чым кампанія танцораў і тэхна–музыкаў. Потым былі альбом The Fat of the Land у канцы 1990–х — вянец поспеху, пасля — няўдалая спроба Флінта сысці і с(т)варыць свой асабісты кіслотны панк, і, урэшце, са слязьмі на вачах, уз'яднанне пад канец 2000–х.

### 1994

У 1994-м Беларусь далучылася да сусветнага музычнага рынку. Згэтуль мы будзем атрымліваць амаль усе музычныя навінкі, хіты і альбомы, са спазненнем максімум у месяц. А ўсё дзякуючы аўдыёпіратам. Амаль у кожным шапіку побач з шакаладкамі і жуйкамі цяпер з'яўляецца хаця б пара касетаў: з запісамі ABBA (для шараговага меламана) і Nirvana — для прасунутага слухача.

У 1994 г. на сценах дамоў, здавалася б, давечны надпіс «Цой жыв» мяняецца на ледзьве зразумелы Nirvana, які са славянскім коранем «рваць» не мае нічога агульнага. Маецца на ўвазе амерыканскі гурт Nirvana, дзе лідэрам быў апошні рок-ідал, Курт Кобэйн. Гэта будзе год яго апошняга бенефісу ў Мюнхене і бясконцых тэлефанаванняў яго жонкі, спявачкі Кортні Лаў, у паліцыю пра мужавы перадозы, а таксама годам яго звядзення рахункаў з бліскуча-змрочным жыццём.

1994. Звонку здаецца, што пазіцыі року непарушныя: хоць дыназаўры, усімі любыя, «Пінк Флойд», распадаюцца, зрабіўшы апошні альбом Division Bell. Распадаюцца, аднак едуць у грандыёзны тур, які збірае па ўсім свеце нячутную датуль лічбу: 5 мільёнаў чалавек у 68 гарадах.

Тройка ацалелых «Бітлоў» у 1994-м таемна збіраецца ў Лондане, каб аранжаваць напяняныя нябожчыкам Джонам Ленанам і захаваныя яго жонкай Ёкай Она мелодыі. Дзёрзкія Offspring і Green Day ў 1994 годзе выдаюць свае звышпаспяховыя альбомы (Smash і Dookie, адпаведна), і крытыкі кажуць пра новае віно ў старых добрых рок-н-рольных мяхах...

Рэп таксама красуе: крымінальнік, але таленавіты рэпер Тупак Шакур у зеніце славы. У гэты год, пад успышкі тэле- і фотакамер, ён адпрацоўвае 15 сутак на грамадскіх працах за збіццё прадусэра Алана Х'юджа. Мадонна, увасабленне поп-музыкі, як заўжды, трохі пяе і шмат эпатуе. Рок, поп і рэп, здаецца, знайшлі формулу мірнага суіснавання, дзе ў кожнага будзе свая ніша і свой слухач. І менавіта тут з'яўляюцца Prodigy...

### Не падпольшчыкі, а падпальшчыкі

Яны стрэлілі ў 1994 годзе альбомам Music for the Jilted Generation («Музыка для пазалочанага пакалення»). З ламанымі эпілептычнымі рытмамі, спрошчанымі да ўзроўню «Саўкі ды Грышкі» мелодыямі, сірэнамі і скавытаннем электронікі, дзіцяча-інфантыльнымі вакаламі і абавязковай трасянкай усіх вядомых навуцы стыляў: ад металу да хіп-хопу. Менавіта пасля гэтага альбома Prodigy ў свеце загаварылі пра феномен «паслямузыкі», дзе пасланне року і чыстая фанавасць попу адыходзяць на другі план, а ўперад высоўваецца, так скажам, узровень моцы вашага прыходу пасля слухання таго ці іншага альбома.

Калі да 1980-х гісторыя сучаснай музыкі была паўстаннем падполляў (року, рэпу) супраць мэйнстрыму і паступовым ўліваннем іх у гэты самы мэйнстрым, дык гісторыя музыкі 1990-х і 2000-х — гэта аповед пра тых, хто змог як пasклад(а)ней спалучыць ужо існыя стылі.

Prodigy нахабна бралі найлепшае з усіх стыляў і бязлітасна іх змешвалі. Жорсткасць рыфаў, дзёрзкасць іміджу, эпатаж у новай музыцы былі даведзеныя да надхмарных максімумаў. З лёгкасцю, націскам адной пімкі на кампутарнай клавіятуры, Prodigy адужвалі эстрадныя і хэвіметалічныя хрыпы ды скокі.

Святое святых року, электрагітара, у руках рэйвераў зрабіліся проста электронным рэжымам на музычных кампутарах. Цяпер яны будуць выкарыстоўваць яе, як ім заманецца: робячы гук яшчэ люцейшым за самы цяжкі метал.

А тэкст адкідаецца зусім — нашто? Пра выклік грамадству адзін кіслотны выгляд зялёных валасоў Кіта Флінта кажа больш, чым сотні словаў «Ролінгаў». Пасля Prodigy Шаўчук будзе выглядаць як ваяўнічы бажаволак, а хэвіметалісты — як дробныя чарцяняты ад філармоніі.

Маралісты, скандалісты і эксгібіцыяністы ж цяпер аб'ядналіся ў адным гурце, дзе шалёныя рытмы, надрыў і хардкоравыя рыфы року, рэчытатывы хіпхопу, папсовыя сінтэзатары — адно сродак, каб як наймацней торкнула.

### «Смерць акупантам!»

У Мінск пасталелыя Prodigy прыедуць прасоўваць свой новы альбом Invaders must die/«Смерць акупантам!». Паводле крытыкаў, альбом з'яўляецца данінай пашаны гурту самім сабе, нібы скарочанай гісторыяй самога гурту з усімі яго ўзлётамі і падзеннямі, пошукамі музычнага стылю, які ёсць — спалучэнне рэйву, хардкору, індастрыялу, брэйк-біту і панку.

У Мінск едуць Prodigy. Хто яны —выключны гурт, вяха ў гісторыі данс-музыкі, музычныя багі, абсалютныя дыктатары ў каралеўстве сучаснай музыкі або прадукт свайго часу, выпадкова ўдалы эксперымент? Адказы знаходзяцца недзе паміж гэтымі двума палюсамі. Эпілептычныя і шалёныя рытмы, што пераходзяць калі ў палітызаваныя рэчытатывы, калі ў зухаватыя, мала не камічныя, прыпевы. Усяго збор-каляда — ажно цяжка зразумець, што да чаго, але гэтак добра — ну, проста як на клубных дансвечарынах, да развіцця культуры якіх Prodigy гэтак моцна прыкладіся.

Такім парадкам: Кіт Флінт, Ліэм Хаўлет і Максім Рыяліці 5 кастрычніка на стадыёне «Дынама», 17.00.

Кошты білетаў ад 90 тысячаў на танцполе да 350 тыс. у VIPавай зоне.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Хто б вы думалі?**
*Зноў «Белтэлерадыёкампанія».*
Заключаць кантракт з «Дзіцячым Еўрабачаннем» — недзіцячая забаўка. У гэтым ужо ў другі раз за месяц пераконваецца выканаўца прыпалай да душы простаму беларускаму народу песні «Чароўны трусік» Юры Дземідовіч. Пасля таго як «Белтэлерадыёкампанія» не дазволіла Юрыю бліснуць на разагрэве ў брытанскага Prodigy, матывуючы гэта ўмовамі конкурснага кантракту, БТ таксама забараніла прадстаўніку нашай краіны на «Дзіцячым Еўрабачанні» здымацца ў стужцы жахаў «Масакра». Пра гэта паведаміў рэжысёр фільма Андрэй Кудзіненка.
Новая трагікамедыя жахаў робіцца паводле матываў «Локіса» Праспера Мэрымэ. Юра Дземідовіч меў выконваць у ёй ролю… каго б вы думалі? Звычайнага беларускага хлопчыка.

# Пад Друцкам знайшлі пахаванне сярэднявечнага спецназу

**Вучоных уразіў рост 38 пахаваных — каля двух метраў.**

Археолагі адкапалі ў Віцебскай вобласці пахаванне старажытных ваяроў. Навукоўцы з Інстытута гісторыі Акадэміі навук адносяць знаходку да XI—XII стагоддзяў.

Яна ўнікальная: адразу 38 пахаванняў паводле паганскага абраду разам. А ў цэнтры — каменны саркафаг. А ў ім знайшлі чэрап. Археолагі не выключаюць, што гэта можа быць пахаванне ваяроў з военачальнікам.

Вучоных уразіў рост большасці пахаваных — каля двух метраў. Нават у наш час гэтыя людзі глядзеліся б асілкамі. Што казаць пра XII стагоддзе, калі сярэдні рост людзей быў усяго каля 160 см (як, напрыклад, у наўгародскага князя Аляксандра Неўскага). З такой дружынай у Сярэднявеччы можна было займацца стварэннем уласнай дзяржавы. На адным з пахаваных археолагі выявілі парэшткі каўнерыка з узорам, характэрным для візантыйскай вопраткі. То бок, людзі гэта былі, найхутчэй, не бедныя і бывалыя.

Хто і ў якой бітве вынішчыў гэты элітны атрад? На гэтае пытанне гісторыкі яшчэ мусяць адказаць. Талачынскі раён — гістарычная Друччына, дзе ў XII ст. княжылі нашчадкі Усяслава Чарадзея. Яны ваявалі з Кіевам, дый міжусобіц хапала.



Друцкае гарадзішча.

У 1116 г. там кіраваў Глеб Усяславіч Менскі (які разам з бацькам сядзеў некалі ў кіеўскім порубе). На Глеба хадзіў вайной кіеўскі князь Уладзімір Манамах. Друцк быў тады ўзяты кіеўскімі войскамі, як адзначае гісторык Вячаслаў Насевіч.

Цікава таксама, што пахаваныя яны паводле паганскага абраду.

Друцкі курган — адзіны ва Усходняй Еўропе, дзе ёсць пахаванні паводле паганскага абраду і разам з тым каменны саркафаг, паведаміла доктар гістарычных навук Вольга Ляўко.

**Сяргей Мікулевіч**

# Розум паляпшае сперму

**Разумныя мужчыны больш сэксуальныя і прывабныя для жанчын, нават калі яны маюць не самыя рэльефныя мускулы.**

Да такой высновы прыйшлі амерыканскія псіхолагі з універсітэта Нью-Мексіка.



У сваёй працы яны даследавалі 400 ветэранаў В'етнамскай вайны, якія прайшлі тэст на інтэлект і здалі сперму на аналіз. Выявілася, што больш якасная і здаровая сперма была ў тых удзельнікаў эксперыменту, якія паказалі лепшыя вынікі IQ-тэсту.

Прафесар Джэфры Мілер выказаў здагадку, што ў разумным мужчыну жанчына, незалежна ад ягонага выгляду, бачыць выдатнага сэксуальнага партнёра, які дазволіць ёй нарадзіць здаровае дзіця.

Гэта важна, бо для жанчыны асноўная біялагічная задача заключаецца менавіта ў нараджэнні дзяцей.

Акрамя таго, Мілер мяркуе, што з часам у чалавеку развіваюцца такія рысы, як уменне прыгожа і правільна гаварыць, высокі інтэлект, пачуццё гумару і самаадданасць менавіта таму, што яны з'яўляюцца прывабнымі для процілеглага полу. Прычым гэта сцверджанне справядліва не толькі з пункту гледжання жанчыны, якая разглядае канкрэтнага мужчыну для будучага супольнага жыцця, але таксама і з пункту гледжання мужчыны, які вывучае жанчыну.

**Паводле gazeta.ru**

# Развод праз ложак

**Для душэўнага і фізічнага здароўя, спрыяльнага маральнага клімату ў сям'і і добрага сну сужэнцам трэба спаць асобна ці на вельмі шырокім ложку, лічаць брытанскія навукоўцы.**

Высветлілася, што агульны ложак вядзе да памяншэння якасці сну, бо людзі рэгулярна будзяць адзін аднаго цягам ночы.

Сямейныя пары, якія спяць разам, на 50% часцей адчуваюць і вонкавае парушэнне сну, чым людзі, якія спяць асобна. Гэта выклікае напружанне ў сямейных адносінах, а таксама праблемы са здароўем, спраўкаваныя недахопам сну, такія, як хваробы сэрца і дэпрэсіі.

Храп, зубоўны скрыгат і кіданне па ложку партнёра — адчуванні малапрыемныя, аднак сужэнцы працягваюць спаць разам, бо ў сацыяльна-культурным сэнсе гэтаму надаецца вялікая значнасць.

Доктар Ніл Стэнлі, эксперт сну з універсітэцкага шпіталя Норфалка, лічыць, што нармальны двухмесны ложак павінен быць у шырыню не менш чым паўтара метра. Доктар адзначыў, што канцэпцыя сужэнскага ложка як месца інтымнага тэт-а-тэту з'явілася ў Брытаніі ў віктарыянскія часы. Аднак інтымнасць добрая толькі для эмацыйнага здароўя.



Фізічнаму і маральнаму здароўю сумесны сон аніяк дапамагчы не можа. Бо сон па сваёй прыродзе з'ява эгаістычная, і дзяліць ложак нельга ні з кім.

**Паводле gazeta.ru**

# Давер да людзей залежыць ад мазжачковай мігдаліны

**Яна кантралюе пачуццё асабістае прасторы, выявілі амерыканскія нейрафізіёлагі.**

Адкрыццё стала магчымым дзякуючы працы з унікальным пацыентам — 42-гадовай жанчынай, якая мае пашкоджанні мігдалепадобнага цела. Яна з цяжкасцю распазнае пагрозу і страх у выразах твараў людзей і не можа выразна судзіць, каму з людзей варта давяраць, а каму — не.




Пацыентка выяўляе празмерную прыязнасць адносна да ўсіх без выключэння людзей, а таму лёгка пераходзіць мяжу, якую людзі завуць асабістай прасторай.

Падчас вызначэння максімальна блізкай камфортнай адлегласці, яна падыходзіла да даследніка на адлегласць каля 0,34 метра, тады як здаровыя добраахвотнікі спыняліся ў сярэднім ля 0,64 метра.

Навукоўцы з дапамогай магнітарэзанансной тамаграфіі высветлілі, што нават думкі пра знаходжанне чалавека заблізка досыць для актывізацыі мігдалепадобнага цела.

Велічыня асабістай прасторы моцна адрозніваецца ў супольнасцях людзей, аб'яднаных розна́й культурай. Найболей яскрава гэтае адрозненне выяўляецца пры параўнанні заходніх краін з усходнімі дзяржавамі. Навукоўцы мяркуюць, што і фармаванне такога паняцця як асабістая прастора адбываецца таксама з удзелам міндалепадобнага цела. Гэта ж вобласць мозга можа «падладжваць» асабістую прастору, калі чалавек трапляе ў нестандартную сітуацыю ці чужую краіну з іншай культурай зносін.

**З РІА «Навіны» пераклала НБ**

### Telegraph: на думку дыетолагаў, вітаміны — пустое марнаванне грошай

Адзін з вядучых дыетолагаў Вялікабрытаніі Браян Рэтькліф лічыць, што вітаміны і харчовыя дадаткі — пустое марнаванне грошай. Акрамя таго, на думку Рэтькліфа, гэтыя прэпараты нярэдка шкодзяць здароўю.

Напрыклад, норма вітаміна А ў арганізме можа быць лёгка перавышаная. Перавышэнне выклікае галаўныя болі і нават павялічвае рызыку астэапарозу, мяркуе дыетолаг. Паводле ягоных словаў, вітамін С можа даць пабочнае ўздзеянне на страўнік.

«Людзі не думаюць, у якіх дозах ім варта прымаць вітаміны і ці варта наогул прымаць», — сказаў Рэтькліф.

**Паводле The Telegraph**

# Перцы прывезлі, і іншыя замарочкі

Кастрычнік — час цяпер купіць ці сабраць самае смачнае і захаваць да зімы–вясны самым здаровым і эканомным спосабам. Піша **Наталка Бабіна**.



Ну што, сезон? Сезон. У краме прадавачка душу раздзірае пазяханнем, разлічваючы мяне на касе. У вёсцы ўсе знаёмыя і ўсё прыязна, таму пытаюся, у чым прычына недасыпу? «Усю ноч закручвала грыбы. Трыццаць літраў закруціла, і яшчэ кош застаўся!» — з прыхаваным (і абсалютна законным) гонарам тлумачыць яна і адсёрбвае кавы.

Такі сезон! Тэрмінова ўбок кампутар, і за рэальную працу! Бо, як казаў той герой мульціка: «А што вы будзеце есці зімой? Не гузікі ж ад штаноў.»

Усё-такі цяпер можна купіць ці сабраць самае смачнае і захаваць да зімы-вясны самым здаровым і эканомным спосабам.

Спосабы захавання прадуктаў вельмі змяніліся з часоў нашых бабуль. Бульбу, гародніну, зімовыя яблыкі захоўвалі тады ў ямах, якія капалі на пагорках — каб не падыходзіла вада. У ямíны ад мышэй клалі палын або тлеючы вугельчык. Капуста і яблыкі пад вясну набывалі смак зямлі... Цяпер, калі гародніну і садавіну захоўваюць у спецыяльных сховішчах, у атмасферы, узбагачанай этыленам, такога смаку мы ўжо не ўведаем. Як не ўведаем смаку салёнага мяса — кумпяка або лапаткі, якія вымочвалі ў крутым саляным растворы або проста крута-крута салілі адразу па разборы вепрука і падвешвалі ад мышэй на бэльку ў каморы або закопвалі ў соль у скрыні там жа. Я вам скажу, летам наступнага года гэта было ўжо нешта спецыфічнае. Вядома, не трынаццацігадовая акула — нацыянальны далікатэс ісландцаў, які, перш чым есці, закопваюць у зямлю на 6 месяцаў і які невыносна тхне гнілінай — але нешта блізкае... Нельга сказаць, што я шкадую, што мяса так больш ніхто не захоўвае...

Зямля, холад і соль — вось асноўныя «кансерванты» нашых продкаў. Ну, і цукар, і воцат — але гэта ўжо толькі для тых, хто багаты, хто клапаціўся не пра тое, каб не галадаць, а пра тое, каб есці смачна.

Асаблівасць старадаўніх рэцэптаў у тым, што яны не існуюць у пісьмовым выглядзе. Іх трэба запамінаць у дзеянні. Колькі ні дабівалася ад мамы і таты, каб далі рэцэпт бязмерна смачнай квашанай капусты, якую робяць штовосень, — нічога не выйшла. Нашынкаваць капусту, на вока солі, на вока кропу, трошкі цёртай морквы і журавінаў, а на дно цэбрыка — скарыначку хлеба і яблычак, даць пастаяць тры дні, перакласці ў слоікі і трымаць у лёху — вось і ўсё, чаго дабілася!

А вось ад свякроўкі пераняла дакладны і вельмі смачны рэцэпт, якому сяброўка дала дакладную назву «сырэнні» — па аналогіі з варэннямі. Гэта ягады, якія ў роўнай прапорцыі пераціраюцца з цукрам і ў слоіках захоўваюцца ў лядоўні. Так можна захоўваць маліны, суніцы, брусніцы, буякі, журавіны. Смаката і водар — неймаверныя! Плюс — усе вітаміны сырых ягад. Закручваць іх не трэба.

Кансервы ж, якія трэба закручваць, — марынады, кампоты, салаты — гэта сапраўды найвышэйшы пілатаж кулінарыі. Бо тут толькі адхіснуўся ўбок ад працэсу, забыў пакласці патрэбны інгрэдыент або даў зламыснай мусе сесці на прастэрылізаваны слоік — таго і чакай, узарвецца, і ўся твая праца на сметнік! А калі не дадаць досыць воцату, існуе імавернасць батулізму... А яшчэ ж трэба глядзець, каб не трэснуў гарачы слоік ад кроплі халоднай вады, каб не лопнула шкло падчас закруткі...

Аптымальны спосаб захоўвання многіх відаў гародніны і грыбоў — замарозка. Хутка і зручна. Скажам, салодкі перац, які масава прывозяць з Малдовы, вельмі зручна марозіць, вычысціўшы сярэдзінкі і складаючы пірамідкамі адзін ў адзін. А зімой — калі ласка: дастаем і фаршыруем або робім рагу ці салаты. Добра надаюцца на замарозку памідоры, спаржавая фасоля, гарошак. Мусіць, будучыня загатовак на зіму — менавіта замарозка.

**Марынаваныя памідоры**

Памідоры для запаўнення 3-х літровага слоіка, вада, 2 сталовыя лыжкі солі, 2 сталовыя лыжкі цукру, 3 сталовыя лыжкі воцату, часнок, перац гарошкам.

Прастэрылізаваць слоік. На дно слоіка пакласці некалькі зубкоў часнаку, гарошынкі перцу. Памідоры вымыць, запоўніць слоік. Закіпяціць ваду, кіпнем заліць памідоры. Зліць кіпень у рондаль, дадаць туды соль, цукар, закіпяціць. У слоік наліць воцат, заліць кіпнем, закруціць. 20 хвілін патрымаць пад коўдрай, затым вынесці ў прахалоднае месца, дзе памідоры мусяць захоўвацца.

**Мочаныя брусніцы**

Запоўніць брусніцамі слоік. Заліць расолам. Расол мае быць насычаным на смак. Для атрымання такога расолу на 1 л



вады дастаткова ўзяць 1 сталовую лыжку солі і 1 сталовую лыжку цукру. Можна дадаць у расол троху карыцы. Мочаныя брусніцы — добры дадатак да страваў з мяса і печані.

**Замарожаныя грыбы**

Любыя ядомыя грыбы пачысціць (у апенькаў адрэзаць ножкі), вялікія грыбы нарэзаць лустачкамі, адварыць на працягу 15—20 хвілін, выняць з адвару і ахаладзіць. Ахалоджаныя грыбы падзяліць



на порцыі і замарозіць у маразілцы ў поліэтыленавых пакетах. Замарожаныя грыбы можна выкарыстоўваць як дадатак да любых страў.

**Квашаныя агуркі**

Агуркі для запаўнення 3-літровага слоіка, вада, 100 мл



солі, ліст хрэну, па 2—3 лісты чорнай парэчкі, вішні, дубу, 3—4 зубкі часнаку, насенне або зеляніна кропу, парашок гарчыцы.

Агуркі старанна вымыць, шчыльна напоўніць 3-літровы слоік, на дно якога пакласці зеляніну і лісце, а таксама зубкі часнаку. 100 мл солі распусціць у халоднай вадзе (прыкладна 300 мл), заліць агуркі, дадаць вады так, каб яна закрывала агуркі цалкам. Захоўваць пад капронавай крышкай у лядоўні або ў лёху. Калі агуркі прасоляцца і ў слоік можна будзе пакласці яшчэ адзін — зрабіць гэта, а таксама дасыпаць зверху троху парашку гарчыцы — яна ратуе ад плесні.

**Марынаваныя перцы**

3 кг чышчанага салодкага перцу, 1 шклянка вады, 1 шклянка цукру, 1 шклянка воцату, 1 шклянка алею, 2 сталовыя лыжкі солі.

З алею, вады, воцату, солі, цукру зрабіць марынад, закіпяціць яго. У марынад, які кіпіць, пакласці разрэзаныя на



4 часткі перцы і бланшаваць 5—7 хвілін. Прастэрылізаваць 3-літровыя слоікі, раскласці ў іх бланшаваны перац разам з марынадам, закруціць.

**«Сырэнне» з ягад**

Узяць у роўнай прапорцыі ягады (брусніцы або маліны, або буякі, або журавіны) і цукар. Перацерці разам таўкачыкам або (лепш) з дапамогай міксера. Перацёртыя ягады перакласці ў чысты посуд (рондаль) і даць пастаяць некалькі гадзін (можна пакінуць на ноч), пасля чаго раскласці па чыстых слоіках і захоўваць пад капронавымі крышкамі ў лядоўні.



# Фестываль Юрыя Башмета



У Беларускай дзяржаўнай філармоніі ад 5 да 10 кастрычніка пройдзе IV Міжнародны фестываль Юрыя Башмета.

**5 кастрычніка** — канцэрт-адкрыццё Маладзёжнай акадэміі краін СНД.

**6 кастрычніка** — выступае Дзяржаўны сімфанічны аркестр Рэспублікі Беларусь

У праграме: П.Хіндэміт, В.А.Моцарт, І.С.Бах

**8 кастрычніка** — выступае Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь.

У праграме: арыі і сцэны з опер П.Чайкоўскага, М.Мусаргскага, Н.Рымскага-Корсакова, В.Беліні, Дж.Вердзі, Ж.Бізэ.

**9 кастрычніка** — выступае Сімфанічны аркестр тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

У праграме: І.Брамс, Р.Шуман.

**10 кастрычніка** — закрыццё Маладзёжнай акадэміі краін СНД.

**Пачатак а 19-й**

## КАНЦЭРТЫ

### Барабанны Біт-2009

Пяты фестываль-конкурс бубначоў «Барабанны Біт» пройдзе **7 кастрычніка ў Палацы культуры МАЗа (Партызанскі пр., 117а)**. **Пачатак фінальнага конкурсу а 10-й, гала-канцэрта — а 19-й. Apple Tea** зайграюць новыя джаз-рокавыя п'есы, **трыа Аляксандра Старажука** пакажа незвычайную горную трубу, **Ян Сапега выступіць з гуртом Green Papper**. **Зміцер Падбярэзскі** выйдзе на сцэну ў якасці вядучага... Завершыць фэст гурт **Drum Extasy**, падчас выступу якога на сцэне з'явяцца ўсе бубначы з бубнамі.

### «Стары Ольса» ў Гальшанскім замку

Гурт «Стары Ольса» адсвяткуе сваё дзесяцігоддзе **3 кастрычніка ў Гальшанскім замку**. У праграме святкавання: рыцарскія забавы і атракцыёны; катанне на конях; выступы гуртоў **Testamentum Terrae**, **«Расалія»**, **«Келіх кола»**; канцэрт гурту **«Стары Ольса»**; фаер-шоу і салют. Папярэдняе набыццё квіткоў і арганізаваны выезд з Мінска — Алесь Кушнер. Т.: (029) 677-00-46.

### Джамбібум

Фолк-гурт «Джамбібум» разам з сябрамі ладзіць сумесны канцэрт **3 кастрычніка ў Строчыцах**. «Музычны кастрычнік» пачнецца **а 15-й**. Удзел возьмуць **«Гаротніца»**, **«Кумалёнтрэ»** і **тэатр агню «Elemental»**. Музыкі абяцаюць «жывы» гук, феерычнае шоу з агнём, выдатны настрой і «экалагічныя» сюрпрызы для публікі.

### Дні швейцарскага джаза ў Беларусі

**9 кастрычніка а 19-й у канцэртнай зале Палаца ветэранаў (вул.Купалы, 21)** — канцэрт **Францыскі Баўман**, **Юрга Солатурмана** і **Крыстофера Бэйлі**. **11, 12 кастрычніка а 19-й у джаз-клубе Я.Уладзімірава (Палац Рэспублікі)** — джазавы канцэрт у працяг Дзён швейцарскага джаза ў Беларусі.

### Пётр Дранга

**6 кастрычніка а 19-й у Палацы Рэспублікі** — канцэрт акардэаніста Пятра Дрангі.

### Восеньскі метал-фэст

**9 кастрычніка ў «Рэактары» (вул.Харужай, 29)** пройдзе Autumn metal fest. Бяруць удзел **Imprudence**, **Serdce**, **Soulsides**, **Distortion**, **Змяя**, **Alert**. **Пачатак у 17.30.**

### Лабараторыя «Князя Мышкіна»

Ансамбль імправізацыйнага псіхадылічнага этна-нойзу «Князь Мышкін» ладзіць канцэрт-лабараторыю «solitario, dueto y cuartet» **7 кастрычніка ў 19.30 у кінатэатры «Цэнтральны» (пр. Незалежнасці,13)**.

## ФУТБОЛ

### БАТЭ—«Эвертан»

**У чацвер, 1 кастрычніка, у Мінску** пройдзе матч 2-га тура групавога турніру Лігі Еўропы паміж барысаўскім БАТЭ і ліверпульскім «Эвертанам». Стадыён «Дынама», **пачатак а 20-й**. Білеты ў касах стадыёна «Дынама» і барысаўскага гарадскога стадыёна. Кошт 10 тыс., 25 тыс., 40 тыс.

## ІМПРЭЗЫ

### Дубавец у Гродне

**У чацвер 1 кастрычніка ў Гродне** пройдзе сустрэча з першым рэдактарам «НН» Сяргеем Дубаўцом. Ён прэзентуе сваю кнігу эсэ «Як?». На сустрэчы яе можна будзе атрымаць бясплатна. **Прыходзьце на сядзібу Таварыства Беларускай Школы (вул.Будзённага 48а-44). Пачатак а 18.30.**

### «Панарама»

IV Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва «Панарама» пройдзе ў Мінску **ад 7 да 31 кастрычніка**. Выступяць тэатры з Польшчы, Швейцарыі, Латвіі, Башкірыі, Літвы, Расіі, Венесуэлы, Эстоніі, Італіі. Беларусь на тэатральным форуме прадставяць: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, а таксама Горкаўскі тэатр, Новы драматычны тэатр, Тэатр юнага гледача, Тэатр лялек і інш.

### Тэра

**11 кастрычніка ў Палацы Рэспублікі** — шоу «Тэра»: цікавы сюжэт, прафесійны танец, незабыўная музыка. **Пачатак а 19-й.**

### Адкрыццё галерэі сучаснага мастацтва «Ў»

**Галерэя сучаснага мастацтва «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** пачне сваю дзейнасць **10 кастрычніка ў цэнтры Мінска**. Першай імпрэзай стане персанальная выстава Сяргея Кірушчанкі «EARTH ART». **27 кастрычніка ў галерэі «Ў»** пройдзе майстар-клас аўстралійскага музыканта, медыя-артыста Бена Фроста. У межах праекта будуць прэзентаваныя некалькі відэаінсталяцый і адбудзецца супольная выстава маладых беларускіх мастакоў.

### Эдуард Акулін і Леанід Дранько-Майсюк на Любаншчыне

Паэты Эдуард Акулін і Леанід Дранько-Майсюк правядуць шэраг сустрэч у вясковых школах Любанскага раёна Мінскай вобласці 8 кастрычніка. А 9-й распачнецца сустрэча ва Урэччы, у школе №1. У СШ №2 паэты завітаюць у 10.30. Школа вёскі Талька будзе рада бачыць паэтаў а 12-й. А ў Сарачынскай школе сустрэча распачнецца ў 13.30.

### Прэзэнтацыя кнігі Міколы Нікалаева «Беларускі Пецярбург»

Прэзэнтацыя кнігі «Беларускі Пецярбург» адбудзецца 2 кастрычніка (пятніца) ў Санкт-Пецярбургу. Мерапрыемства пачнецца ў памяшканні Цэнтральнага музея сувязі (уваход: Паштамскі зав., 4) а 18-й.

## ВЫСТАВЫ

### Драздовіч, Сергіевіч, Сеўрук

У Мастацкім музеі ідзе выстава «Заходняя Беларусь у мастацтве». Можна пабачыць творы мастакоў, чые імёны былі адкрытыя мастацтвазнаўцамі толькі ў сярэдзіне 80-х. У Мінск прывезеныя творы, што захоўваюцца ў рэгіянальных музеях, прыватных зборах. Гэтая акалічнасць робіць выставу ўнікальнай. Звярніце ўвагу на творы Язэпа Драздовіча. Пётры Сергіевіча, Міхася Сеўрука — гэтыя вяршыні беларускага мастацтва XX ст.

### Тэхна-арт. Жалеза

**Ад 2 да 18 кастрычніка ў галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл, 1)** будзе працаваць новая выстава серыі праекта «Тэхна-арт». «Жалеза» будзе прадстаўленае працамі вядомых беларускіх мастакоў: Уладзіміра Цеслера, Вадзіма Качана, Андрэя Шчукіна, Валерыя Вядрэнкі, Віталія Раковіча, Юрыя Васільева і многіх іншых.

### Здымаў граф Тышкевіч

**У Музеі гісторыі і культуры (вул.Маркса, 12) ад 6 кастрычніка** будзе працаваць фотавыстава графа Бенедыкта Тышкевіча. Калекцыя з'яўляецца часткай фондаў музея Нісефора Ньепса горада Шалон на Соне (Францыя). **Пасля 29 кастрычніка выстава пераедзе ў Гомель, у будынак галерэі Вашчанкі (вул.Карповіча 4), дзе будзе экспанавацца ад 4 да 17 лістапада. З 20 лістапада да 8 снежня выстава будзе ў мастацкай галерэі Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка (вул.Маркса 2а).**

### Выстава адной «Мадонны»

**Ад 2 да 30 кастрычніка ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** будзе працаваць выстава адной карціны. Гэта твор італьянскага жывапісца Парыса Бардонэ «Мадонна з дзіцем, святым Энрыка з Упсалы і святым Антоніа Падуанскім» з калекцыі Музея правінцыі Бары (Італія).

### Вада + Фарба

**У Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3) да 8 кастрычніка** працуе выстава графікі II міжнароднага біенале «Вада + Фарба». Экспануюцца 144 творы 70 мастакоў з Беларусі, Літвы, Латвіі, Украіны і Расіі. Канцэпцыя праекта — сабраць у адным месцы творы мастакоў розных творчых пакаленняў, паказаць магчымасці акварэльнага жывапісу. У экспазіцыі Вы зможаце ўбачыць работы, выкананыя з выкарыстаннем акрылу, элементамі калажа, прыёмамі канцэптуальнай падачы задумы.

## ТЭАТРЫ

**1 кастрычніка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

**Тэатр оперы і балета** — «Багема»

**2 кастрычніка**

**Тэатр оперы і балета** — «Шчаўкунок»

**3 кастрычніка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Ігвіта, альбо Як гэта рабілі ў Францыі»

**Тэатр оперы і балета** — «Чужое багацце нікому не служыць»

**6 кастрычніка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»

**Тэатр юнага гледача** — «Апошняя дуэль»

**Тэатр оперы і балета** — «Травіята»

**7 кастрычніка**

**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

**Тэатр оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»

**Тэатр юнага гледача** — «Шчаўкунок»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Кабала святош (Мальер)»

**8 кастрычніка**

**Тэатр імя Горкага** — «Бег»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сёстры Псіхеі»

**Тэатр юнага гледача** — «Матылёк»

**9 кастрычніка**

**Тэатр лялек** — «Чаму старэюць людзі»

**Тэатр юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Каласы пад сярпом тваім»

**Тэатр оперы і балета** — «Эсмеральда»

**10 кастрычніка**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Раман + Юлія»

**Тэатр оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»

**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»

**11 кастрычніка**

**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»

**Купалаўскі тэатр** — «Вяселле»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Сурагаты для Бруса Уіліса



**Сурагаты** (Surrogates)

ЗША, 2009, каляровы, 104 хв.

**Рэжысёр:** Джонатан Мостау

**Ролі выконваюць:** Брус Уіліс, Уінг Рэміс, Разамунд Пайк, Рада Мітчэл

**Жанр:** Фантастыка

**Адзнака:** 6,5 (з 10)

Каб пазбегнуць жыццёвых нягодаў, людзі знаходзяць сабе заменнікаў. Робаты-сурагаты ходзяць на працу, ваююць, мілуюцца, а бесклапотныя людзі кіруюць імі са сваіх ложкаў. Нязгодныя з сурагатным светам загнаныя ў рэзервацыі...

Ад рэжысёра Джонатана Мастоу, які паспяхова сапсаваў трэцяга «Тэрмінатара», незвычайнага не чакалі. Так і ёсць: карэктны баевічок з аўтагонкамі, гелікоптэрамі, манекенападобнымі робатамі і шчаслівым фіналам. Прафесійны і граматны фільм-сурагат.

Але ідэя робатаў-двайнікоў настолькі плённая, што спараджае каштоўныя кадры.

Брус Уіліс — баявы манекен з адной рукою, які зухавата скача па дахам , і Брус Уіліс — жывы чалавек, састарэлы, зляканы, нязграбны. Гумавыя твары робатаў — і холад адчужэння. Беларускія гледачы прыгадаюць «Электроніка» і фантастыку Станіслава Лема.

Нечаканыя падмены, калі забойцы маскіруюцца чужымі робатамі. Чалавечыя пачуцці, што заглушаюцца ў сурагатным свеце новага шчасця з гламурна-гумавымі прапорцыямі.

Пастралялі, павесяліліся, адсурагаціліся. Вяртаемся ў рэальнасць без сурагатаў.

**Андрэй Расінскі**

### Польскае кіно пра Другую сусветную вайну

**Да 3 кастрычніка ў кінатэатры «Цэнтральны»** — праграма польскіх фільмаў пра другую сусветную вайну.

**1 кастрычніка** — «Праўда пра Вэстэрплятэ», «Я жыў, як хацеў». **Пачатак а 19-й**

**2 кастрычніка** — «Вялікае паляванне: Армія Краёва едзе ў Сібір», «Жыццё за акраец хлеба». **Пачатак а 19-й**

**3 кастрычніка** — «Мы ціха-цёмныя. Галасы жывых». **Пачатак а 19-й.**




# Камунікат.org запрашае!

**Каб пабываць ў гэтай бібліятэцы, не трэба выходзіць з дому.**

Інтэрнэт-бібліятэка Камунікат.org узнікла ў 2000 годзе як прыватная ініцыятыва і стваралася на грамадскіх пачатках. З часам сціплы збор публікацыяў перарос у буйную бібліятэку, якая сёння з'яўляецца адной з найбольш папулярных у сеціве.

Камунікат.org — праект Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку. Ён супрацоўнічае з рэдакцыямі многіх перыёдыкаў Беларусі і замежжа, з выдавецтвамі і аўтарамі, з навукоўцамі і даследчыкамі.

Па адрасе www.kamunikat.org знойдзеце публікацыі як класікаў беларускай літаратуры, так і пачаткоўцаў. Багатыя зборы гістарычнай літаратуры і кніг, недаступных у традыцыйных бібліятэках Беларусі, робяць Камунікат.org крыніцай інфармацыі для студэнтаў і навукоўцаў.

Тут можна таксама пазнаёміцца з навінкамі друку розных краінаў свету — усё, што выдаецца беларусамі і пра беларусаў: навуковыя даследаванні, слоўнікі, метадычныя дапаможнікі, матэрыялы, якія маюць сувязь з беларускасцю ва ўсіх яе праявах, — усё гэта знойдзеце на старонках Інтэрнэт-бібліятэкі Камунікат.org.

Камунікат.org у рамках праекту «Беларускія аўтары» дае таксама магчымасць ствараць персанальныя сайты беларускіх пісьменнікаў, публіцыстаў і даследчыкаў.

Ад нядаўна ўзорам праекту «Беларускія аўтары» распачаў працу новы праект — «Беларускія выдаўцы і выдавецтвы». Тут ствараюцца інтэрнэт-сайты з інфармацыяй пра асобных выдаўцоў. На сайтах таксама з'яўляецца інфармацыя пра кнігі, выдадзеныя імі, якія знаходзяцца ў рэсурсах Камунікат.org.

У планах чарговы праект — «Выдавецкія серыі».

Каб пабываць ў гэтай бібліятэцы, не трэба выходзіць з дому — дастаткова ўключыць кампутар. Не трэба чакаць у чарзе па кнігу — яны даступныя ўвесь час.

**Кантакт: kamunikat@kamunikat.org**

БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАСАЮЗ

# Форум грамадзянскай супольнасці

У сваім Паведамленні па Усходнім партнёрстве ад 3 снежня 2008 г. Еўрапейская Камісія (ЕК) прапанавала «стварыць Форум грамадзянскай супольнасці ў рамках Усходняга партнёрства для развіцця сувязяў між Арганізацыямі грамадзянскай супольнасці (АГС) і спрыяння іх дыялогу з дзяржаўнымі органамі». ЕК правяло адпаведнае апытанне.

На думку удзельнікаў апытання, удзел ФГС у дасягненні мэтаў Усходняга партнёрства мусіць рэалізавацца праз:

– спрыянне супрацоўніцтву між АГС і ўмацаванне іх ролі ў краінах-удзельніцах Усходняга партнёрства;

– падачу тэхнічнай дапамогі дзейнасці ў рамках Усходняга партнёрства на двухбаковым і шматбаковым узроўні;

– прасоўванне прынцыпаў і каштоўнасцей ЕС у краінах-удзельніцах Усходняга партнёрства.

ЕК будзе браць пад увагу наступныя крытэрыі адбору:

– геаграфічнае паходжанне/нацыянальная прыналежнасць — большасць удзельнікаў ФГС мусяць быць з краін-удзельніц Усходняга партнёрства. Значная колькасць таксама мае паходзіць з краін-сябраў ЕС і міжнародных арганізацый, што дазволіць ладзіць абмен досведам па пытаннях дзейнасці/палітыкі ЕС. Могуць быць запрошаныя АГС з трэціх краінаў;

– разнастайнасць і прапарцыянальнасць — удзельнікі ФГС мусяць прэзентаваць усю разнастайнасць суб'ектаў грамадзянскай супольнасці (прафсаюзы, арганізацыі працадаўцаў, прафасацыяцыі, недзяржаўныя арганізацыі, аналітычныя цэнтры, некамерцыйныя фонды, АГС). Яны маюць быць здольнымі да ўдзелу ў рэалізацыі ўсіх тэматычных аспектаў Усходняга партнёрства, а менавіта: 1) дэмакратыя, належнае дзяржаўнае кіраванне і стабільнасць; 2) эканамічная інтэграцыя і зближэнне з палітычнымі курсамі ЕС; 3) увага да навакольнага асяроддзя і энергетычная бяспека; 4) кантакты між людзьмі;

– досвед працы па пытаннях, звязаных з ЕС/ЕПС/УП (з улікам мінулых і сучасных мерапрыемстваў, дасягнутых вынікаў).

Удзельнікі апытання сышліся на думцы, што ЕК павінна арганізаваць першую канферэнцыю ФГС. Некаторыя прапанавалі, каб па першым часе ЕК ўзяла на сябе вызначэнне працоўнай праграмы і задач ФГС.

У доўгатэрміновай перспектыве прапаноўвалася ўскласці на яе забеспячэнне фінансавай, матэрыяльна-тэхнічнай падтрымкі ў правядзенні форумаў і мерапрыемстваў; кардынацыю дзейнасці, што ажыццяўляецца ў рамках ФГС і платформаў Усходняга партнёрства; палітычную падтрымку дзейнасці ФГС (дыялог з мясцовымі органамі ўлады, прасоўванне ФГС як аднаго з істотных кампанентаў Усходняга партнёрства).

ТЭЛЕПРАГРАМА НА 21—27 ВЕРАСНЯ

# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

### 5 кастрычніка, панядзелак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 21 серыя
**19:50** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:20** Госць «Белсата»
**20:40** Беларусы ў Польшчы
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ягайла» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Ноч без месяца», маст. фільм, рэж. Артан Мінаролы, 2004 г., Албанія—Францыя.
**22:45** Аб'ектыў

### 6 кастрычніка, аўторак

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** МакраФон: «Жывёлак» і «Стылё»
*Канцэрт фальклорных гуртоў у студыі Польскага радыё на фестывалі «Новая традыцыя». Гурт «Жывёлак» грае аўтарскую музыку, заснаваную на народных матывах і інтэнсіўным абмене энергіяй, што адпавядае канцэпцыі world music. Этна-джазавы гурт з Варшавы «Стылё» ў сваёй музыцы змешвае элементы розных культураў з джазавымі імправізацыямі, дадаючы непаўторную рок-энергетыку.*
**19:35** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**20:10** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**20:40** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Крыжакі» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** Блізкая гісторыя: іншы погляд: «Загуж — апошні прыпынак», дак. фільм, рэж. Юлія Ісхакава, 2009 г., Польшча—Расія
**21:50** Аўтастопам праз Еўропу, 4 серыя: Бельгія
**22:10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**22:25** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы: «Манахі» (сатырычная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 7 кастрычніка, серада

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**19:35** Форум (ток-шоу): «Беларуская пенітэнцыярная сістэма»
**20:25** Рэпартэр (публіцыстычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 27 серыя
**22:20** Асабісты капітал (эканамічная праграма)
**22:40** Аб'ектыў

### 8 кастрычніка, чацвер

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял: 21 серыя
**19:35** YoLife! (моладзевая праграма)
**20:00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:30** «Бульбаны», мультсерыял: «Прыгоды ў цырку»
**20:35** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 15 серыя: «Сталіца Еўропы»
*Стужка прысвечаная сённяшняму Бруселю, былой сталіцы Брабанту, а пазней Бургундыі. Яшчэ ў Сярэднявеччы лёс наканаваў гораду хуткае развіццё і багацце, бо ляжаў на важным гандлёвым скрыжаванні з Галандыі ў Францыю і з Англіі на кантынент.*
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Давыд Гарадзенскі» (спазнаваўчая праграма)
**21:30** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял: 1 серыя
**22:20** Без рэтушы: «Памагатыя смерці», дак. фільм, рэж Аляксандр Ступнікаў, 2009 г., Беларусь
**22:40** Аб'ектыў

### 9 кастрычніка, пятніца

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Аблавушак», мультсерыял
**19:15** «Такіх песень сабе шукаю», рэж. Ягна Кнітэль, 2008 г., Польшча
*Фільм быў зняты ў межах праекта «Украіна архаічная і сучасная — песні і людзі». Аўтары паказваюць спевакоў з палескіх вёсак Перабродзы і Старыя Коні на ўкраінска-беларускім памежжы. Першы раз аўтары ў пошуках старадаўніх песень трапілі ў гэтыя мясціны некалькі гадоў таму. Яны адкрылі для сябе не толькі архаічныя песні, але і ўнутраны свет іх выканаўцаў, натуральны сінтэз жыцця, побыту і вусна-паэтычнага мастацтва палешукоў. Праз чатыры гады кінадакументалісты зноў завіталі ў гэтыя мясціны, каб спевакі раскрылі ўсе скарбы народнае творчасці, якія інакш чакае забыццё — разам з адыходам у нябыт апошніх майстроў традыцыйнае песні.*
**19:55** Невядомая Беларусь: «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дак. фільм, рэж. Антон Цялежнікаў, 2009 г., Польшча, ч. 1
*У фільме расказваецца пра адзін з найцяжэйшых перыядаў у гісторыі Беларусі XX ст. Нішто дагэтуль не абуджае такіх гарачых спрэчак, як нямецкая акупацыя Беларусі 1941—1944 гг. Прыход фашыстаў на Беларусі меў тыя ж эканамічныя наступствы, што і ў іншых акупаваных краінах Еўропы. Новыя гаспадары імкнуліся паставіць чалавечы і гаспадарчы патэнцыял краю на службу патрэбам Трэцяга Райху. Аднак Беларусь трапіла пад акупацыю не як суверэнная дзяржава, а як частка шматнацыянальнай Савецкай імперыі...*
**20:35** Госць «Белсата»
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Ці існаваў старажытнарускі народ?» (спазнаваўчая праграма)
**21:25** «Вяселле», маст. фільм, рэж. Войцех Смажоўскі, 2004 г., Польшча.
*Фільм пачынаецца сцэнаю цырымоніі шлюбу дачкі мясцовага багатыра Веслава Войнара, Касі, і Януша. Для бацькі нявесты вяселле робіцца добраю нагодаю падкрэсліць сваю значнасць і пахваліцца заможнасцю. У якасці шлюбнага падарунку ён дорыць маладым прыгнаны з Нямеччыны аўтамабіль. Дзеянне фільма няўхільна набліжаецца да катастрофы. І хоць Войнар не шкадуе сродкаў, абы толькі не нарабіць сораму сям'і і давесці вяселле да канца, у выніку траціць усё: жонку, дачку, грошы. Рэжысёр высмейвае польскі менталітэт, найперш — імкненне пусціць пыл у вочы: няшмат змянілася з часоў стварэння вядомай аднайменнай п'есы Станіслава Выспяньскага.*
**23:05** Аб'ектыў

### 10 кастрычніка, субота

**19:00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня)
**19:05** «Аблавушак», мультсерыял
**19:20** Аўтастопам праз Еўропу, 5 серыя: Парыж
**19:35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма)
**20:00** Еўропа сёння (тэлечасопіс канала «Нямецкая хваля»)
**20:25** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма)
**21:00** Аб'ектыў (галоўны выпуск)
**21:10** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў гусіцкіх войнах» (спазнаваўчая праграма)
**21:20** Суботні сеанс: «Заткніся і забі мяне», маст. фільм, рэж. Стын Арго, 2005 г., Вялікабрытанія—Чэхія.
*Прыгоды англійскага турыста Коліна Фрэмптана, які падчас наведвання Прагі раптам страчвае сваю каханую. Зламаны горам, ён вырашае пайсці следам за ёю на той свет і наймае чэха Зэмана дапамагчы яму памерці. Зэман згаджаецца, бо яму патрэбныя грошы на задавальненне капрызаў ягонай жонкі. Усё ўскладняецца, калі ў справу ўмешваецца мясцовы гангстэр Карэл Карлавіч.*
**22:45** Аб'ектыў




### 11 кастрычніка, нядзеля

**19:05** «Аблавушак», мультсерыял
**19:15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў)
**19:30** «Элі Макбіл», тэлесерыял: V сезон, 22 серыя (апошняя)
**20:10** Форум (ток-шоу): «За калючым дротам. Ці мы гатовыя да дэмакратыі?»
*Кажуць, што кожны народ мае такую ўладу, якую заслугоўвае. Ці сапраўды беларусы заслугоўваюць таго, што з імі адбываецца ў апошнія гады? Калі адзін чалавек вырашае, што павінна рабіць уся краіна? Можа, так лепш для ўсіх? Але ж людзі — не бараны...*
**21:00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21:25** Акно ў Еўропу (інфармацыйная праграма)
**21:50** Фільматэка майстроў: «Пупенда», маст. фільм, рэж. Ян Гржэбейк, 2003 г., Чэхія.
*Сям'я таленавітага скульптара Бэдржыха Мары пасля акупацыі Чэхаславаччыны ў 1968 г. апынулася на ўзбочыне жыцця, практычна без сродкаў да існавання, бо тата — багемны выпівака і нонканфарміст — не пайшоў на супрацу з камуністычным рэжымам. Аднак ягоная былая вучаніца Магда і ейны муж — дырэктар школы Мілаш Бржэчка — выдатна ўладкаваліся пры новых парадках і занялі высокія пасады. Усё змяняецца пасля таго, калі Бэдржых прыводзіць дадому былога прафесара, беспрацоўнага мастацтвазнаўцу Алёіза Фабэра і прапаноўвае яму кантракт на выраб манумента «савецкага вызваліцеля маршала Рыбалкі»...*



У некаторых месцах сталіцы Беларусі крызісам і не пахне. На фота: 24 верасня ў клубе «Roxy» дзяўчаты біліся на рынгу, залітым шакаладам.






На дзень стварэння камсамола актывісты БРСМ зладзілі перформанс «Ты запісаўся добраахвотнікам?» у скверы імя Дзяржынскага ў Мінску. Яны ўвасаблялі сабой савецкія агітацыйныя плакаты. А следам сябры Беларускай хрысціянскай дэмакратыі зладзілі там акцыю «Ты запісаўся ў Курапаты?», усклаўшы да помніка заснавальніку ЧК-НКВД нацыянальны сцяг з запаленымі свечкамі.

## КНІГАРНЯ «НАША НІВА»

# Каты Ёзафа Ратцынгера

Невялікія па форме тэксты Сяргея Астраўца будзе лёгка чытаць у грамадскім транспарце. Не прыйдзецца пастаянна прыгадваць, на чым спыніліся мінулым разам, як тое бывае пры чытанні раманаў і аповесцяў. Самае вялікае апавяданне зойме вас не больш, чым на тры аўтобусныя прыпынкі. Пасля чаго можна ўзяцца за наступнае.

Кнігу «Каты Ёзафа Ратцынгера» склалі выбраныя тэксты аўтара, якія друкаваліся ў «Нашай Ніве» ў перыяд з 1991 па 2007. Выданне стала своеасаблівым падарункам да 50-годдзя, якое літаратар адзначыў сёлета.

**КМ**




**Каты Ёзафа Ратцынгера / Сяргей Астравец. Апавяданні, эсэ, зацемкі, рэпартажы з Горадні.** — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2009. — 248 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).



Гэты год неўраджайны на грыбы.


## Беларускі Калегіум прапануе

дадатковае навучанне па спецыялізацыях: журналістыка, найноўшая гісторыя, філасофія/літаратура, спецкурс па фатаграфіі.

Запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў, асобы з вышэйшай адукацыяй.

Навучанне ў БК — бясплатнае. Пачатак заняткаў з 5 кастрычніка 2009 г.

Дадатковая інфармацыя: bk.baj.by, т.: (029) 276-27-15, (029) 679-26-82


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**З «Паштовай скрынкі».** Кра-Кра з мястэчка Гервяты: Хрэн разводзіць выгадна. Насення купіце ў Вільні.

***

Краю мой родны! Як выкляты Богам —
Столькі ты зносіш нядолі.
Хмары, балоты... Над збожжам убогім
Вецер гуляе паволі...

**Максім Багдановіч**

**Наша Ніва. 1909. №37–38**

## ЖАРТЫ

***

Сядзіць мужык, на паплавок глядзіць. Гадзіну сядзіць, другую... На трэцюю гадзіну ў ванную ўваходзіць жонка:

— Добра, чорт з табой! Ідзі на рыбу, а то мне мыць бялізну трэба!

***

Больш за ўсё жонку дратавала, што пасля таго як яна, пагасціўшы пару дзён у мамы, вярталася, дык муж, нягледзячы на тое, што шмат працаваў, выглядаў пасвяжэлым і адпачылым.

***

У кватэры звоніць тэлефон. Падыходзіць сабака і здымае пашчай слухаўку.

«Гаў!» — «Алё!» — «Гаў!» — «Алё! Вас не чутно, кажыце па літарах». — «Ганна, Алесь, Уладзімір!»

***

Ліст у газету:

«У мяне канфіскавалі самагонны апарат, ці магу я атрымаць кампенсацыю ў сувязі са стратай карміцеля?»

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАННІ

**Віншуем Андрэя Лянкевіча** з Народзінамі! Жадаем моцнага здароўя, аптымізму і бясконцага палёту фантазіі. Сябры і калегі

**Яроменкава Алеся віншую** з 37-годдзем! Жадаю моцнага здароўя, шчасця, радасці, матэрыяльнага дабрабыту. З павагай, Аляксей

### ПАДАРУ, ПРАДАМ

**Падару чахол для скрыпкі.** Жорсткі. Т.: (044) 721-22-71

**Прадам б/у манітор** Самсунг 2005 года. 17 дзюймаў. Не ЖКІ. Т.: (029) 139-59-11

### ДОМ

**Прадаецца** дом на беразе возера. 60 км ад МКАД, 8500 у.а., без гандлю. Т.: (029) 115-22-43

### КОНКУРС

**Абвяшчаецца** конкурс на найлепшы лагатып Нацыянальнага гістарычнага музея. Пераможцу – грашовы прыз. Падрыхтаваныя матэрыялы перадаюцца на e-mail: histmuseum@tut.by або па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 12. Даведкі праз т.: (017) 227-00-05

### СВАБОДНЫ ТЭАТР

**Свабодны тэатр праводзіць набор** слухачоў у тэатральную майстэрню «Фартынбрас». У заяўцы павінны быць указаны: прозвішча, імя; адукацыя; дата нараджэння; кароткая інфармацыя аб сабе, а таксама прыкладзена эсэ ў вольнай форме на тэму «Навошта мне гэта трэба» (не менш за старонку). Заяўкі неабходна адпраўляць адначасова на два адрасы: maniasha92@yahoo.com і free_theatre@yahoo.com

### ВЫШЫЎКА І ВЫЦІНАНКА

**Абвяшчаецца набор** на курсы беларускай народнай вышыўкі і выцінанкі (Мінск). Выкладчык — майстар народнай творчасці Галіна Рудніцкая. Тэл.: (029) 171-13-90, (017) 283-76-09. E-mail: zoraczka@tut.by

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


Наша Ніва
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



©НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6160. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.09.2009.
Замова № 5341.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128. ISSN 1819-1614
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12